

**Аграгарадкі: прадаць дом будзе складаней**

СТАР. 4



**Як правільна ўжываць грыбы?**

СТАР. 5



**Першы помнік Хлебу**

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ВЕРАСНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 170 (27780) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# КАБ «КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ» НАС НЕ ПСАВАЛА...

## Арэнднае жыллё павінна давацца на справядлівых падставах і па разумнай цане

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам аб парадку прадастаўлення жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання ў жылым комплексе «Магістр» віцэ-прэм'ера Анатоля Калініна, міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэя Шорца і старшыню Мінгарвыканкама Мікалая Ладуцьку, паведамляе БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што рашэнне аб будаўніцтве адпаведнага жылога комплексу было прынята для забеспячэння жыллём прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі, асабліва моладзі. «Мы дамовіліся, што гэта будзе арэнднае жыллё. Яно не будзе танным для наймальніка, але яно і не будзе мець завоблачную цану, якую сёння плацяць маладыя сем'і, здымаючы прыватную кватэру. Арэнднае жыллё павінна быць значна таннейшым», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што ў пытанні фарміравання кошту на арэнднае жыллё нельга памыліцца, каб у далейшым не пераглядаць яе ў той ці іншы бок. Ён адзначыў, што канкрэтны кошт павінен быць канчаткова вызначаны на ўзроўні ўрада і Мінгарвыканкама.

Яшчэ адно прынцыповае пытанне, на якім засяродзіў увагу Прэзідэнт, — нязменнае прытрымліванне прынцыпу сумленнасці і справядлівасці пры размеркаванні і фарміраванні чаргі на арэндныя кватэры. «Гэта пытанне нумар адзін. Не дай Бог да мяне пойдуць скаргі, што недзе нехта сваім сваякам, яшчэ камусьці, уладкаваўшы іх папярэдне на нейкую пасаду, пачне з-пад крыса выдзяляць гэтыя кватэры, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта вельмі актыўная частка насельніцтва — творчая і навуковая інтэлігенцыя, і маўчаць яны не будуць. Яны мяне імгненна праінфармуюць аб тым, што недзе нешта несправядліва вырашана. Таму прынцып прыстойнасці і справядлівасці, калі мы фарміруем чаргу, павінен быць пакладзены ў аснову гэтага працэсу».

Паводле слоў Прэзідэнта, безумоўна, павінна быць забяспечана і якасць арэнднага жылля, якое прадастаўляецца.

«Сваё слова я сказаў. Прэзідэнт прыняў рашэнне — арэнднаму жыллю быць. Пачалі новае будаўніцтва, пайшло па краіне гэта новаўвядзенне. Давайце ў Прэзідэнта абмяркуем некаторыя прынцыпы аплаты, фарміравання чэргаў, выдзялення жылля і гэтак далей. І то вы павінны мяне проста праінфармаваць. А далей, калі ласка, дзяліце і нясіце адказнасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

# АСВЕТА ЯК ТРЫУМФАТАР,

## або Дзень, калі паліцы з кнігамі «адбіваюць» пакупнікоў у крам з прысмакамі







Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

**Адзін з найстарэйшых гарадоў краіны ў мінулыя выхадныя сустрэў гасцей дваццаць першага па ліку Дня беларускага пісьменства. Заслаўю стаць цэнтрам свята давялося не ўпершыню: таямнічыя імёны Рагнеды і Ізяслава (у гонар якога названы горад) прывабілі арганізатараў у 2000 годзе. Легенда аб героях далёкага X стагоддзя і ў гэты раз згадвалася неаднойчы.**

СТАР. 3

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі:**

***«У нас ёсць усе падставы гаварыць аб тым, што з гэтага года пачнецца сапраўднае аздараўленне эканомікі аграпрамысловага комплексу. Для гэтага падрыхтавана і запрацавала нарматыўна-прававая база ў выглядзе чатырох указаў, якія істотным чынам дапамогуць аздаравіць эканоміку сельгасарганізацый і прадпрыемстваў, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку. Пад гэта мы падвялі галоўныя паказчыкі ў нашай працы. Краіна ўпершыню мае такі высокі вынік — намалочана больш за 9 млн т збожжа. Засыпаны харчовыя запасы ў аб'ёмах больш за 1 млн т; нарыхтавана насенне; грамадская жывёлагадоўля забяспечана ў поўным аб'ёме фуражным збожжам, што дазволіць спыніць яго закупкі з-за межаў краіны і стварыць сапраўдны падмурак развіцця аграрнай эканомікі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.09.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10470,00 | ▲ |
| Еўра | 13550,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 282,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 817,84 | ■ |

# ПРАВОЎ БЕЗ АБАВЯЗКАЎ НЕ БЫВАЕ

**У інтэрв'ю «Звяздзе» Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падзяліўся сваімі разважаннямі пра некаторыя актуаліі грамадскага і парламенцкага жыцця**



**— Уладзімір Паўлавіч, як вы лічыце, чаму нас вучаць падзеі ва Украіне?**

— Трагічныя падзеі ў братняй нам Украіне вучаць нас берагчы мір і згоду ў грамадстве, палітычную стабільнасць, міжнацыянальную і міжрэлігійную згоду — усё тое, чым наша Беларусь вылучаецца на працягу дваццаці апошніх гадоў не толькі на постсавецкай прасторы, але і ва ўсёй Еўропе. Берагчы, цаніць і ўсяляк умацоўваць, бо ахвотнікі ўсё гэта ўзяць на зуб, расхістаць, раскалашмаціць не ўпусцяць свой шанц, калі мы яго ім па недаглядзе дадзім.

**— Слова «стабільнасць» у некаторых палітычных колах выклікае рэзкую крытыку.**

— Яны, напэўна, ведаюць, чаго хочуць.

**— А чаго хочуць людзі, з якімі вы сустракаецеся і гутарыце падчас рабочых паездак у выбарчую акругу і ў іншыя рэгіёны? Што для іх самае галоўнае?**

— Тое, пра што я ўжо сказаў — стабільнасць у дзяржаве, упэўненасць у заўтрашнім дні, здароўе, нармальны заробак, добрае жыллё, шчасце сваіх дзяцей. Акрамя гэтага, асноўнага, лічаць вельмі важным арганізацыю вытворчасці, сацыяльную інфраструктуру, забеспячэнне дамоў прыродным газам, належныя ўмовы для правядзення вольнага часу, заняткаў фізкультурай і спортам, дагледжаныя дарогі, транспартныя зносіны з буйнымі гарадамі. Кажу не толькі пра вяскоўцаў, але і жыхароў райцэнтраў і гарпасёлкаў. Увогуле ж узровень іх патрэб значна вышэйшы, чым, скажам, дваццаць-трыццаць гадоў таму. Жыццё, пры ўсіх сённяшніх праблемах, прыкметна палепшылася, чаго чалавек здаровага розуму адмаўляць не будзе. Адпаведна і патрэбы ўзрастаюць.

**— На мясцовых начальнікаў людзі вам скардзяцца?**

— Зрэдку бывае і такое. Але галоўным чынам размова ідзе пра пытанні гаспадарчага, камунальнага і сацыяльнага зместу, для вырашэння якіх неабходны дадатковыя фінансавыя сродкі, а значыць, і пэўны час.

**— Сродкі знаходзіце?**

— Сумесна з кіраўніцтвам прадпрыемстваў і рэгіёнаў: нешта з мясцовых рэсурсаў, а нешта вырашаем пры дапамозе абласных і рэспубліканскіх дзяржаўных органаў.

**— Мяркуючы па дыскусіях на так званых «урадавых гадзінах» падчас сесійных пасяджэнняў парламента, дэпутаты даволі сур'ёзна займаюцца пытаннямі сваіх выбаршчыкаў, асабліва грамадскага значэння, і даволі востра ставяць іх перад членамі ўрада. А ці ўвасабляецца гэта ў законах?**

— Калі б не ўвасаблялася, то навошта былі б і законы! Але трэба разумець, што не кожную слушную прапанову абавязкова неабходна афармляць у нарматыўным акце, тым больш заканадаўча.

СТАР. 2

# ПРЫЕМНАСЦІ ДА СВЯТА

## Мінчан чакаюць традыцыйныя зніжкі

**З нагоды Дня горада прадпрыемствы бытавога абслугоўвання Мінска з 10 па 12 верасня прадаставяць ільготы некаторым катэгорыям насельніцтва. У прыватнасці, зніжкі чакаюць удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, пенсіянераў, інвалідаў, шматдзетныя сем'і.**

Некаторыя цырульні ў гэтыя дні абслужаць ветэранаў, пенсіянераў, інвалідаў, членаў шматдзетных сем'яў бясплатна, іншыя — са зніжкай на стрыжку ў 20-50%. Адрамантаваць абутак і швейныя вырабы з 10 па 12 верасня ў некаторых майстэрнях можна будзе са зніжкай у 10-50%.

Акрамя таго, 13-14 верасня адзіны дзень зніжак пройдзе ў сталічных універмагах. Выгадныя пакупкі можна будзе зрабіць у ГУМе, ЦУМе, гандлёвым доме «На Нямізе», універмагу «Беларусь» і гандлёвым цэнтры «Кірмаш».

— Зніжкі да свят у нас традыцыйныя, таму катэгорыі грамадзян, якія могуць імі скарыстацца, заўсёды іх чакаюць, — паведаміла «Звяздзе» **начальнік аддзела арганізацыі і развіцця сферы паслуг упраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама Настасся МАКАРСКАЯ**. Паводле яе слоў, найбольш актыўна ў час дзеяння зніжак мінчане карыстаюцца паслугамі цырульняў, хімчыстак і майстэрняў па рамонце абутку і адзення. Настасся Макарская таксама адзначыла, што памер зніжак вызначаюць самі прадпрыемствы, якія іх прадастаўляюць. З іх пералікам можна азнаёміцца на сайтах Мінгарвыканкама і ўпраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання, а таксама ў гарадскіх газетах.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

### ■ Надвор'е

# АМАЛЬ ШТО ЛЕТА

## На працягу тыдня прыгрэе да 20-26 цяпла

**Ужо другі тыдзень на тэрыторыі Беларусі трымаецца бадай летняе надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Пры павышаным фоне атмасфернага ціску ў аўторак будзе пераважна без ападкаў, толькі на захадзе месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 19-25 градусаў. Потым надвор'е крыху сапсуецца, бо да нас завітае атмасферны фронт з боку Польшчы. Таму з серады па пятніцу пераважна па заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы ў гэтыя трое сутак будзе на ўзроўні плюс 9-15 градусаў, аднак ужо ўдзень павялічыцца да 19-26 цяпла. Толькі ў сераду ўдзень на захадзе краіны будзе плюс 16-18 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, напрыканцы тыдня — у суботу і нядзелю — зноў прагназуецца павелічэнне атмасфернага ціску. Чакаецца пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. У гэтыя дні будзе сапраўды камфортнае цёплае надвор'е, калі тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8-15 градусаў, а ўдзень чакаецца 20-26 цяпла. Спецыялісты адзначаюць, што сёлета маладое «бабіна лета» больш нагадвае надвор'е другой паловы жніўня.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Польшча абвергла інфармацыю аб пастаўках зброі Кіеву

Міністр абароны Польшчы Томаш Семаняк абверг інфармацыю аб тым, што Варшава будзе пастаўляць Кіеву сучаснае ўзбраенне. Паводле яго слоў, заява ўкраінскіх улад была «фальстартам і памылкай». «Гэта вельмі сур'ёзнае пытанне, якое павінны абмяркоўваць на перамовах урада. А не тое, пра што варта інфармаваць усіх у блогу», — прыводзяць СМІ словы міністра. Палітык адзначыў, што пытанні супрацоўніцтва паміж Украінай і НАТА, у прыватнасці, паміж Кіевам і Варшавай, магчыма, стануць тэмай далейшых перамоў. Раней прадстаўнік прэс-службы міністэрства абароны Нарвегіі Ларс Емблe таксама абверг інфармацыю аб пастаўках узбраення ва Украіну. Заява польскага міністра стала адказам на паведамленне ў Facebook Юрыя Луцэнкі — саветніка прэзідэнта Украіны. У нядзелю, 7 верасня, ён напісаў у сацыяльнай сетцы аб тым, што на саміце НАТА была дасягнута дамоўленасць аб пастаўках зброі з Польшчы, ЗША, Францыі, Нарвегіі і Італіі.

### ААН: на ўсходзе Украіны загінулі 3 тыс. чалавек

Пра гэта заявіў Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека Зейд Раад Зейд аль-Хусэйн. «Мы па-ранейшаму занепакоеныя сітуацыяй ва Украіне. Апошняя штомесячная справаздача ўпраўлення Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека дае поўную карціну бягучых праблем правоў чалавека, асабліва на ўсходзе, дзе, прынамсі, 3000 чалавек былі забіты, пачынаючы з сярэдзіны красавіка гэтага года», — заявіў аль-Хусэйн.

### Каралеўская сям'я ў Вялікабрытаніі чакае папаўнення



Спадчыннік брытанскага трона прынц Уільям і яго жонка герцагіня Кембрыджская Кэтрын чакаюць другое дзіця, паведамляецца ў заяве Букінгемскага палаца ў Facebook. Паводле інфармацыі агенцтва, герцагіня адчувае сябе блага па раніцах — тое ж яна адчувала падчас першай цяжарнасці. Другое дзіця герцагаў Кембрыджскіх будзе чацвёртым у чарзе на трон. Першынец пары прынц Джордж нарадзіўся 22 ліпеня 2013. Ён стаў трэцім у чарзе на брытанскі трон пасля свайго дзеда прынца Чарльза і бацькі.

ISSN 1990 - 763X

14170>

9 771990 763008

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Бананы значна змяншаюць верагоднасць інсульту ў жанчын



Навукоўцы раяць усім жанчынам ва ўзросце есці бананы. Яны дазваляюць зменшыць рызыку інсульту, піша The Daily Mail. На працягу 11 гадоў спецыялісты праводзілі абследаванне 90137 жанчын ва ўзросце 50-79 гадоў. Прадмет цікавасці — аб'ём спажывання калію, наяўнасць гісторыі інсульту ці факт смерці. Бананы, як вядома, багатыя на калій. І яны здольны знізіць рызыку інсульту прыкладна на чвэрць. Паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, за дзень жанчынам варта спажываць 3,510 міліграма і больш. Толькі 16,6% удзельнікаў даследавання спажывалі калій у такім аб'ёме. Банан сярэдняга памеру змяшчае прыкладна 430 міліграмаў. Жанчыны, якія спажывалі больш за ўсё калію, на 12% радзей перажывалі інсульт у цэлым і на 16% радзей перажывалі ішэмічны інсульт у параўнанні з жанчынамі, якія спажываюць калію менш за іншых. Такім чынам, актыўнае спажыванне калію можа прынесці больш карысці да таго, як разаўецца гіпертанія. Пры гэтым жанчыны, якая актыўна спажывалі калій, на 10% радзей паміралі заўчасна. На калій багатыя бульба, бананы і белая фасоля. Але лішак калію небяспечны для сэрца, пра што таксама варта памятаць.

### КОРАТКА

Генеральнае консульства Беларусі з'явіцца ў італьянскім Мілане.

**Часовая забарона на вываз гарбарнай сыравіны і дубленага паўфабрыкату ўведзена ў Беларусі.**

На рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў пададзена 98 заявак, у тым ліку 48 заявак для ўдзелу ў намінацыі «Лепшы інавацыйны праект» і 50 — у намінацыі «Лепшы маладзёжны інавацыйны праект».

**Новыя ўспышкі асабліва небяспечнага захворвання — афрыканскай чумы свіней — зарэгістраваны на тэрыторыі Панявежскага павета Літвы.**

Масавая вакцынацыя супраць грыпу ў Мінску пачнецца ў кастрычніку.

**Беларуская каманда заняла першае месца ў агульным заліку на X чэмпіянаце свету па пажарна-выратавальным спорце ў Алматы.**

### ■ Расклад на заўтра

# ШТО Ў САЦЫЯЛЬНЫМ ПАКЕЦЕ ДЛЯ ПЕДАГОГА?

**Ад чаго залежыць сацыяльны статус педагога: ад узроўню яго заробкаў, магчымасці вырашыць жыллёвае пытанне, упэўненасці ў заўтрашнім дні або ад першага, другога і трэцяга разам? А можа, сацыяльны статус — гэта яшчэ і імідж прафесіі педагога ў грамадстве? Відэабрыфінг, які прайшоў у Міністэрстве адукацыі з удзелам прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў, павінен быў даць адказ на пытанне: што робіцца для таго, каб педагагічныя спецыяльнасці сталі прыцягальнымі для школьных выдатнікаў? Якія захады рэалізуюцца на месцах для таго, каб маладыя спецыялісты заставаліся працаваць ва ўстановах адукацыі пасля адпрацоўкі па размеркаванні і як заахвочваюцца настаўнікі да павышэння сваёй кваліфікацыі і якасці працы?**

**Міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ** лічыць, што сёння недастаткова ўвагі надаецца маральнаму стымуляванню педагагічных работнікаў . За першае паўгоддзе гэтага года дзяржаўных узнагарод былі ўдастоены 15 работнікаў сістэмы адукацыі. 120 работнікаў атрымалі нагрудны знак «Выдатнік адукацыі», 207 былі ўзнагароджаны ганаровай граматай Міністэрства адукацыі і 523 работнікі атрымалі граматы галоўнага адукацыйнага ведамства.

СТАР. 2



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ШТО Ў САЦЫЯЛЬНЫМ ПАКЕЦЕ ДЛЯ ПЕДАГОГА?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але, на думку міністра, у сістэме адукацыі працуе намнога больш выдатных асоб, заслугі якіх варта заахвоціць. Сяргей Маскевіч лічыць, што да канца года кожная вобласць павінна прадставіць на званне «Заслужаны настаўнік» яшчэ як мінімум па адным кандыдаце. Між іншым, зараз у стадыі распрацоўкі знаходзіцца пытанне аб увядзенні звання «Народны настаўнік». Гэта будзе яшчэ адна прыступка, на якую зможа ўзняцца педагог.

— Тыя ідэі, якія выспяваюць у прафесійнай супольнасці, прафсаюз заўсёды даводзіць да ведама і Міністэрства адукацыі, і іншых дзяржаўных органаў кіравання, — зазначыў **намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА**. — Рост надбавак за наяўнасць кваліфікацыйных катэгорый — гэта тое, да чаго мы імкнуліся апошнія тры-чатыры гады. Наша ўвага была прыкавана да большай дыферэнцыяцыі ў аплаце працы паміж педагагічнымі работнікамі, якія маюць першую, вышэйшую кваліфікацыйныя катэгорыі і катэгорыю «настаўнік-метадыст». Для нас гэта было асноўнай задачай. Магчыма, яе вырашэнне падштурхне маладых спецыялістаў паглядзець на школу і ўвогуле на сістэму адукацыі як на сістэму свайго доўгатэрміновага развіцця, сваёй доўгатэрміновай кар'еры. Даплата за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі цяпер будзе займаць у заробках настаўнікаў значна большую «вагу». І гэта правільна...

Але нам ёсць яшчэ над чым працаваць. Два гады таму мы па просьбе Міністэрства адукацыі распрацавалі свае прапановы па напаўненні сацыяльнага пакета для педагогаў з улікам вопыту суседніх краін, у які ўвайшлі пытанні пенсійнага забеспячэння, жыллёвыя пытанні, гарантыі ў сферы адукацыі, кампенсацыі выдаткаў на праезд, зніжкі на камунальныя паслугі, мабільную сувязь і многія іншыя захады. Штосьці з нашых прапаноў ужо пакрысе пачало ўкараняцца (напрыклад, з'явіліся сацыяльныя тарыфы на мабільную сувязь для педагогаў. — **Аўт.**). Штосьці яшчэ знаходзіцца ў стадыі разгляду... Нам здаецца вельмі цікавым досвед нашых калег з Казахстана, дзе педагогам у апошнія гады выплачваецца дапамога на аздараўленне ў памеры не меншым за службовы аклад. Больш за тое, зараз у Казахстане вырашаецца пытанне аб павелічэнні гэтай дапамогі да памеру двух службовых акладаў.

**Рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Аляксандр ЖУК** лічыць неабходным зрабіць наведванне музеяў для педагогаў бясплатным, а на білеты ў тэатры практыкаваць зніжкі, каб педагогі мелі магчымасць для ўласнага самаразвіцця і пашырэння кругагляду.

— Ад таго, які настаўнік будзе працаваць з падрастаючым пакаленнем, ад сацыяльнага самаадчування педагога залежыць выхаванне прафесіяналаў, а значыць, будучыня нашай краіны, — падкрэслівае Аляксандр Жук. — І калі мы хочам бачыць вынік, значыць, павінны падтрымліваць прафесіяналаў.

Напярэдадні Дня настаўніка перад уваходам у галоўны педагагічны ўніверсітэт краіны з'явіцца скульптурная кампазіцыя «Настаўніца першая мая», якая, магчыма, прымусіць грамадства задумацца над роляй настаўніка ў нашым жыцці.

— Калі казаць аб павышэнні прэстыжу прафесіі педагога, то гэта не толькі фінансавая падтрымка і матэрыяльнае стымуляванне. Пра работу педагога бацькі і соцыум мяркуюць па яе якасці, па ўзроўні дасягненняў яго навучэнцаў. А гэта значыць, што педагог павінен мець максімальна шмат часу і магчымасцяў для таго, каб якасна падрыхтавацца да вучэбных заняткаў. Але, на жаль, сёння педагогі вымушаны выконваць шмат неўласцівых ім функцый, у выніку чаго мы страчваем якасць адукацыі — тое, на што ў першую чаргу павінен працаваць педагог, — канстатавала **першы намеснік начальніка Упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Жанна ВАРАБЕЙ**.

Размова ішла таксама пра тое, што сёння наймальніку ў сістэме адукацыі вельмі складана падвесці матывацыйную базу пад тое, каб малады спецыяліст застаўся ў яго працаваць. Павышэнне заробкаў, якое адбылося з 1 верасня, маладых педагогаў закранула ў найменшай ступені. Да атрымання кваліфікацыйнай катэгорыі ім яшчэ трэба «дарасці». Але ці хопіць цярплівасці ў маладых настаўнікаў? Або ім прасцей будзе праз два гады збегчы з адукацыі ў іншую сферу?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПРАВОЎ БЕЗ АБАВЯЗКАЎ НЕ БЫВАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дастаткова бывае элементарнай выканаўчасці, дзелавітасці адпаведных службовых асоб і ініцыятывы саміх людзей, каб пытанне не ўзнікала і тым больш не абвастралася. Вырашэнне многіх задач аблягчаецца там, дзе праяўляюць, паўтараю, простую дзелавую разваротлівасць.

**— З гэтым цяжка не пагадзіцца, але ж і ад законаў шмат што залежыць.**

— Несумненна, таму заканадаўчае забеспячэнне дзяржаўнага будаўніцтва, развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы пастаянна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі парламента. Палатай прадстаўнікоў цяперашняга дэпутацкага складу прыняты шэраг важных законаў, якія адпавядаюць грамадскім інтарэсам і дзяржаўным задачам. На чарговай, пятай сесіі, якая адкрыецца 2 кастрычніка, мы працягнем работу ў гэтым кірунку.

**— Ужо агучаныя папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання будуць разгледжаны?**

— Дакумент рыхтуецца да другога чытання.

**— Нагадайце галоўныя новаўвядзенні.**

— Мяркуецца даць права абласным Саветам дэпутатаў і Саветам дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню самастойна вызначаць катэгорыі грамадзян, якім будзе аказвацца сацыяльная падтрымка, а выканкамам пярвічнага ўзроўню — права ствараць камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы па аказанні грамадзянам паслуг у будаўніцтве і рамонце жылых дамоў, а таксама гаспадарчых пабудоў на зямельных участках грамадзян. Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам законапраект дазваляе фінансаваць выдаткі на інвестыцыйныя праграмы і праекты органаў мясцовага кіравання і самакіравання пярвічнага ўзроўню з іх бюджэтаў.

**— Канструяванне агульнаабавязковых нарматыўных прадпісанняў — справа няпростая?**

— Вельмі няпростая, і была б для нас яшчэ значна больш працаёмкай, калі б не было адзінай дзяржаўнай заканатворчай сістэмы, аб'яднанага інтэлектуальнага патэнцыялу суб'ектаў права заканадаўчай ініцыятывы і парламентарыяў з апорай на экспертную супольнасць і шырокую грамадскую думку. Гэта несумненнае дасягненне праватворчай палітыкі ў нашай дзяржаве.

**— Цяпер ідзе грамадскае абмеркаванне праекта новага Закона «Аб барацьбе з карупцыяй». Напэўна, ён стане адным з ключавых у праграме асенняй сесіі Палаты прадстаўнікоў?**

— Калі ён паступіць у парламент, мы яго разгледзім у першую чаргу.

**— Наколькі, на ваш погляд, запатрабаваны закладзеныя ў законапраекце меры супрацьдзеяння карупцыі?**

— Тое, што дакумент па даручэнні Прэзідэнта вынесены на шырокае грамадскае абмеркаванне, падкрэслівае яго асаблівую грамадскую і дзяржаўную важнасць. Карупцыя — зло, якое пагражае грамадскаму спакою і нацыянальнай бяспецы, таму меры барацьбы з ёю павінны быць сістэмнымі, што і прадугледжвае законапраект. Вялікае значэнне грамадскага абмеркавання антыкарупцыйных захадаў бачыцца мне не толькі ў магчымасці змястоўнага ўдасканалення дакумента, але і ў яго ўплыве на свядомасць грамадзян, выпрацоўку правільных, законапаслухмяных паводзін. Думаю, гэта павінна зрабіць больш адчувальнымі крокі да мінімізацыі і блакіроўкі карупцыйных злачынстваў.

**— На нарадзе, прысвечанай комплекснай карэкціроўцы крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што заканадаўства ні ў якім разе не павінна ствараць умоў для пазбягання адказнасці. Што будзе зроблена на асенняй сесіі Палаты прадстаўнікоў для рэалізацыі ў законах прынцыпу непазбежнасці пакарання за здзейсненыя злачынствы?**

— Гэты прынцып у прававой базе рэалізуецца. Разам з тым работа над папраўкамі ў крымінальнае, крымінальна-працэсуальнае, адміністрацыйнае і іншае заканадаўства, якое рэгламентуе пытанні адказнасці і бяспекі, вядзецца з пункту гледжання неабходнасці прапанаваных новаўвядзенняў у сучаснай сітуацыі, на што і звярнуў увагу заканадаўцаў Прэзідэнт. Умацаванне мер адказнасці за злачынствы, асабліва грамадска небяспечныя, дакладнае размежаванне правоў і абавязкаў — такі наш падыход ва ўдасканаленні прававой базы. Так, напрыклад, да другога чытання рыхтуюцца змены і дапаўненні ў некаторыя кодэксы, якія ўзмацняюць крымінальную адказнасць за незаконнае паляванне і незаконную здабычу рыбы. Прадугледжаны таксама меры адміністрацыйнай адказнасці за адміністрацыйныя правапарушэнні, якія наносяць шкоду навакольнаму асяроддзю і супярэчаць парадку прыродакарыстання.

**— Вы лічыце настолькі важным дакладнае размежаванне ў заканадаўчых актах правоў і абавязкаў?**

— Правоў без абавязкаў не бывае. Не павінна быць і расплывістасці, няпэўнасці ў іх фармуліроўцы. Што такое абавязкі? Яны не зводзяцца толькі да належнага выканання пэўных функцый на сваім рабочым месцы. Гэта нормы годных, у глыбокім сэнсе, паводзін у дачыненні да сваёй дзяржавы, а таксама на прадпрыемстве, ва ўстанове, ва ўзаемаадносінах з кіраўнікамі і падначаленымі, у калектыве, у грамадскіх месцах, у сям'і, на прыродзе, у дачыненні да калег, сяброў, незнаёмых людзей. Калі чалавек іх наўмысна парушае, а то і ігнаруе, то законы павінны паказаць яму, мякка кажучы, яго памылку. Чым менш такіх памылак, тым больш парадку, спакою і згоды ў грамадстве і ў душы чалавека.

**— Па традыцыі асенняя сесія Палаты прадстаўнікоў бюджэтная. Дэпутаты прымаюць удзел у распрацоўцы галоўнага фінансавага дакумента краіны на наступны год?**

— Прымаюць. Нядаўна праект бюджэту Рэспублікі Беларусь на 2015 год быў абмеркаваны на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.

**— Можна чакаць прыняцця добра прапрацаванага, збалансаванага і рэалістычнага дакумента?**

— На гэта настроены ўсе ўдзельнікі бюджэтнага працэсу. Урад і парламент яшчэ чакае значная работа над бюджэтнымі пазіцыямі.

**— Уладзімір Паўлавіч, асенняя сесія будзе напружанай?**

— У пастаянных камісіях палаты ўжо больш за 50 законапраектаў, амаль палова з якіх прапрацоўваецца да абмеркавання ў другім чытанні. Сярод гэтых дакументаў блок папраўак у дзейнае заканадаўства па пытаннях гаспадарчых таварыстваў, прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці, гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў фізічных асоб, абароны інфармацыі, забеспячэння пагранічнай бяспекі, супрацьдзеяння гандлю людзьмі, лекавых сродкаў. Ідуць узгадняльныя працэдуры па праекце Закона «Аб рынку каштоўных папер». Нядаўна на разгляд дэпутатаў унесены праект Лясного кодэкса Рэспублікі Беларусь. Дакументы працягваюць паступаць. Так што сесія будзе змястоўна насычанай і, я ўпэўнены, плённай.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

«Прамая лінія»

## УСЁ ПРА ДАПАМОГІ

Калі вас цікавяць асаблівасці атрымання дапамог па часовай непрацаздольнасці і дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, то вы можаце 16 верасня з 11.00 да 12.00 задаць свае пытанні падчас прамой тэлефоннай лініі, якая пройдзе ў рэдакцыі газеты «Звязда». У «прамой лініі» будуць удзельнічаць **першы намеснік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонда сацыяльнай абароны насельніцтва ЖАМЧУЖНІКАЎ Уладзімір Міхайлавіч** і **начальнік аддзела сацыяльнага страхавання ШУШКЕТ Аксана Юр'еўна**. Спецыялістам можна будзе задаць пытанні па тэлефоне 8-017-2871871.

Папярэдне пытанні прымаюцца па тэлефоне 8-017-2923802.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПЛЮС 80 МІЛЬЁНАЎ

**Па выніках жніўня золатавалютныя рэзервы нашай краіны, згодна з метадалогіяй МВФ, павялічыліся на 80 млн долараў ЗША і, паводле папярэдніх звестак, на 1 верасня склалі 6 291,5 млн долараў у эквіваленце.**

У нацыянальным вызначэнні рэзервы павялічыліся на 89,3 млн долараў і на 1 верасня склалі 7 269,1 млн. «Павелічэнню золатавалютных рэзерваў спрыяла станоўчае сальда куплі-продажу Нацыянальным банкам замежнай валюты і размяшчэнне валютных аблігацый Міністэрства фінансаў на ўнутраным рынку краіны, — паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. — Пры гэтым у жніўні ўрадам і Нацыянальным банкам былі выкананы ў поўным аб'ёме знешнія і ўнутраныя абавязацельствы ў замежнай валюце».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## АЎТАМАБІЛЬНАЕ ПАЛІВА СТАЛА ДАРАЖЭЙШЫМ

**З 9 верасня зноў павялічыліся цэны на аўтамабільнае паліва, паведамляе прэс-служба канцэрна «Белнафтахім».**

Цяпер кошт аднаго літра дызельнага паліва (К4) складзе 10 950 рублёў (учора было 10 500 рублёў), бензіну АІ-95 — 10 850 рублёў (10 400 рублёў), АІ-92 — 10 100 рублёў (было 9 700 рублёў). Нагадаю, што да гэтага апошняе павышэнне рознічных і адпускных цэн на нафтапрадукты адбылося 19 жніўня і склала ў сярэднім 4,3%.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## МУЖНАЯ АЛЕНА

**Падзяку за непасрэдны ўдзел у забеспячэнні грамадскага парадку на тэрыторыі раёна і гадзіннік з гравіроўкай «За асабістую мужнасць» атрымала з рук начальніка Магілёўскага РАУС Паўла Смірнова дзевяцікласніца сярэдняй школы вёскі Усход Алена Горская.**



Алена зрабіла неверагодны для дзяўчынкі ўчынак, на які здольны не кожны мужчына. Гуляючы з сябрамі ў вячэрні час каля возера, яна пачула крыкі аб дапамозе і кінулася на выручку. Калі ўбачыла, як адзін мужчына паваліў другога на зямлю і б'е нагамі, яна пачала яго адцягваць. На крыўдзіцеля гэта падзейнічала працверажальна, ён пакінуў сваю ахвяру і ўцёк. А дзяўчына адразу ж вызвала «хуткую дапамогу» і да апошняй хвіліны знаходзілася каля пацярпелага. Пра мужны ўчынак вучаніцы цяпер ведаюць не толькі ў школе, перад вучнямі і настаўнікамі якой узнагародзілі дзяўчыну, але і ва ўсёй вёсцы. Што датычыцца крыўдзіцеля, то ён затрыманы, у дачыненні да яго распачата крымінальная справа.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ПАД ВЕТРАЗЕМ

**Брастаўчанін сам пабудаваў яхту і спусціў яе на ваду.**

Праграміст Дзмітрый Суяркаў ажыццявіў першае пробнае плаванне па Мухаўцы на яхце, якую ён узводзіў некалькі гадоў. Раней Дзмітрый планаваў перасячы Ціхі акіян і здзейсніць падарожжа вакол свету, але цяпер, правёўшы першае плаванне, зразумеў, што для такой экспедыцыі яго судна замалое. Але былы наведвальнік брэсцкага клуба юных маракоў на адзін крок наблізіўся да сваёй дзіцячай мары аб вялікіх водных падарожжах.

Падтрымаць Дзмітрыя прыехалі яго сябры і аднадумцы з Мінска. Яхта Oleksa пад белым ветразем у выхадны дзень прыцягнула ўвагу многіх брастаўчан.

**Яна СВЕТАВА.**

## «ПЕРАХАПІЎ» САМАЗАБОЙЦУ

**У сталіцы выратавальнік прадухіліў суіцыд, схапіўшы самазабойцу за ногі.**

Выклік работнікам МНС паступіў увечары: на 19-м паверсе дома па вуліцы Цімашэнкі мужчына рыхтаваўся развітацца з жыццём. Ён стаяў на казырку лоджыі і хацеў скокнуць уніз. У момант падзення выратавальнік схапіў 56-гадовага мужчыну за ногі. Потым разам з напарнікам выратаванага чалавека транспартавалі на дах дома і перадалі медыкам. Мужчыну даставілі ў РНПЦ псіхічнага здароўя.

## ДЗІЦЯ ВЫПАЛА З АКНА

**Пакінутая дома без нагляду шасцігадовая дзяўчынка ўпала з шостага паверха.**

Трагедыя адбылася ў сталіцы пасля поўначы: у цэнтр аператыўнага ўпраўлення Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС у 0.19 паведамілі пра падзенне дзіцяці з акна кватэры на шостым паверсе на казырок крамы па вуліцы Слабадской. У 0.32 брыгада хуткай медыцынскай дапамогі канстатавала смерць дзяўчынкі... Як было ўстаноўлена папярэдне, Крысціна пражывала ў здымнай кватэры разам з маці, жанчынай 1986 года нараджэння. На момант трагедыі дзяўчынка знаходзілася ў кватэры адна: маці загінулай з'явілася толькі каля 1.20 ночы. Расследаванне абставін здарэння праводзіць упраўленне Следчага камітэта г. Мінска.

## ЗАТРЫМАЛІ «АЛКАБУС»

**Супрацоўнікі ДПС аддзела ДАІ і аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Кастрычніцкага РУУС сталіцы затрымалі на вуліцы Сцебянёва двух жыхароў Гродзенскай вобласці, якія незаконна ўвезлі на тэрыторыю нашай краіны буйную партыю алкагольнай прадукцыі.**

У салоне мікрааўтобуса, які належаў знаёмаму аднаго з затрыманых, знаходзіліся тысяча бутэлек гарэлкі і 172 пяцілітровыя каністры са спіртавой вадкасцю. На алкагольную прадукцыю адсутнічалі неабходныя дакументы, таксама груз не быў маркіраваны ў вызначаным заканадаўствам парадку. Прыяцель уласніка мікрааўтобуса патлумачыў, што гарэлку і спіртавую вадкасць набыў у Расіі для наступнай рэалізацыі ў Гродне. Затрыманым пагражае адміністрацыйная адказнасць за незаконную перавозку алкаголю, а таксама штрафныя санкцыі ў памеры да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй тавару.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Соцыум



## ПРАЖЫТАЧНЫ МІНІМУМ БУДЗЕ РАЗЛІЧВАЦЦА ПА-НОВАМУ

Урад Беларусі зацвердзіў пражытачны мінімум для асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва і Палажэнне аб парадку разліку бюджэту пражытачнага мінімуму па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах і ў сярэднім на душу насельніцтва. Такое рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў ад 4 верасня 2014 года нумар 865, якая ўступае ў сілу з 17 верасня, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

Як адзначыла начальнік упраўлення комплекснага аналізу Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Юшкевіч, пастанова нумар 865 распрацавана ў адпаведнасці з артыкулам 5 закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях вызначэння пражытачнага мінімуму».

Цяпер пражытачны мінімум складаецца з мінімальных набораў прадуктаў харчавання для асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва; нехарчовых тавараў і паслуг, кошт якіх вызначаны як фіксаваная доля ў памеры 77 працэнтаў ад кошту мінімальнага набору прадуктаў харчавання.

«Наборы прадуктаў харчавання сфарміраваны на аснове норм фізіялагічных патрэбнасцяў у харчовых рэчывах і энергіі для розных груп дарослага і дзіцячага насельніцтва. Прадуктовыя наборы адпавядаюць патрабаванням рацыянальнага харчавання і захоўваюць неабходную энергетычную каштоўнасць і хімічны састаў, — растлумачыла прадстаўнік міністэрства. — Фіксаваная доля вызначана на падставе афіцыйнай статыстычнай інфармацыі Белстата аб фактычных спажывецкіх расходах малазабяспечаных хатніх гаспадарак за апошнія пяць гадоў (з 2009 па 2013 год уключна), а таксама за першы квартал бягучага года».

Паводле яе слоў, для вызначэння фіксаванай долі нехарчовых тавараў і паслуг улічваліся такія спажывецкія артыкулы расходаў малазабяспечаных хатніх гаспадарак, як расходы на адзенне, абутак, тканіну; мэблю, прадметы бытавога прызначэння; асабістыя паслугі, прадметы асабістага карыстання; жыллёва-камунальныя паслугі; ахову здароўя; паслугі адукацыі; паслугі грамадскага транспарту; сувязь.

Палажэннем вызначаны парадак разліку бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ), замацоўваецца перыяд дзеяння БПМ пры яго штоквартальным зацвярджэнні Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны (да гэтага часу БПМ зацвярджаўся рашэннем урада).

Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны БПМ па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах і ў сярэднім на душу насельніцтва будзе зацвярджацца (як і раней урадам) у цэнах апошняга месяца кожнага квартала. Так, БПМ на перыяд з 1 лютага па 30 красавіка — у цэнах снежня; з 1 мая па 31 ліпеня — у цэнах сакавіка; з 1 жніўня па 31 кастрычніка — у цэнах чэрвеня; з 1 лістапада па 31 студзеня — у цэнах верасня.

БПМ разлічваецца для шасці асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва — працаздольнае насельніцтва; пенсіянеры; студэнты; дзеці ва ўзросце да 3 гадоў; ад 3 да 6 гадоў; ад 6 да 18 гадоў.

У якасці бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва прымаецца сярэднедушавы бюджэт пражытачнага мінімуму сям'і з чатырох чалавек.

Кошт прадуктаў харчавання, што ўключаецца ў БПМ у сярэднім на душу насельніцтва, вызначаецца як кошт мінімальнага набору прадуктаў харчавання для сям'і з чатырох чалавек (мужчыны працаздольнага ўзросту, жанчыны працаздольнага ўзросту, хлопчыка ва ўзросце 13 гадоў і дзяўчынкі ва ўзросце 7 гадоў).

Парадак разліку расходаў на ўзносы і плацяжы не змяніўся для БПМ у сярэднім на душу насельніцтва і для БПМ працаздольнага насельніцтва.

■ А не шкодзь!

## Ударылі браканьераў «па кішэні»

**Пасля ўступлення ў сілу новых правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання колькасць парушэнняў у гэтай сферы знізілася, канстатуюць у Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

Так, за ліпень-жнівень выяўлена 120 фактаў невыканання правілаў з боку паляўнічых і карыстальнікаў угоддзяў, што на 20 працэнтаў менш, чым за аналагічны леташні перыяд. Пры гэтым падчас незаконных паляванняў загінула нашмат менш дзікіх жывёл: за два месяцы ўсяго 9 асобін відаў, якія нармуюцца (лось, дзік, алень і інш.), у той час як летась іх было 25.

У Дзяржінспекцыі нагадалі, што магутным стрымальным фактарам стала ўзмацненне адказнасці за нелегальнае паляванне. З 26 чэрвеня сумы для разліку пакрыцця шкоды за незаконную здабычу дзікіх жывёл павялічыліся ў сярэднім у тры разы.

Апроч гэтага, у краіне працягваецца праца над удасканаленнем заканадаўчых нормаў у сферы палявання. Плануецца ўвядзенне ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь дадатковага артыкула, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за транспарціроўку і разбор туш дзікіх жывёл без дазвольных дакументаў, у той час як зараз гэтыя парушэнні цягнуць за сабой адміністрацыйную адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

■ Меркаванне

# ПОЎНЫ АБО ЧАСТКОВЫ ПОСПЕХ?

## Што можа перашкодзіць урэгуляванню канфлікту на ўсходзе Украіны



**Дамоўленасці, дасягнутыя 5 верасня ў Мінску падчас сустрэчы трохбаковай кантактнай групы па Украіне, могуць завяршыцца поўным поспехам у спыненні кровапраліцця, а могуць і частковым, што дасць бакам час для таго, каб аказаць эфектыўную дапамогу пацярпелым удзельнікам грамадзянскай вайны, у тым ліку і мірнаму насельніцтву. У любым выпадку, гэта добры пачатак на фоне пастаяннага ваеннага проціборства мінулых дзён і вялікіх ахвяр, неабходнасць якіх цяжка растлумачыць. Якія праблемы могуць паўстаць у далейшым урэгуляванні цяперашняй цяжкай сітуацыі на ўсходзе Украіны?**

Перш за ўсё, вядома, каласальны дэфіцыт даверу паміж бакамі. Там, дзе толькі што лілася кроў і рабіліся заявы пра вайну да пераможнага канца, нягледзячы на ахвяры, цяжка адразу чакаць гатоўнасці імгненна прымірыцца, забыўшыся на ўсё.

Ужо з'явілася інфармацыя аб тым, што па пункце пратакола, які абвяшчае «неадкладна вызваліць усіх закладнікаў і незаконна ўтрыманых асоб», у бакоў ёсць сур'ёзныя розначытанні. Так, па заявах прадстаўнікоў мяцежных Данецка і Луганска, яны ў адказ на вызваленне ўзятых у палон украінскіх вайскоўцаў чакаюць, што на волю будуць адпушчаныя ўсе іх прыхільнікі, у тым ліку арыштаваныя і ў месцах, дзе ваенныя дзеянні непасрэдна не вяліся. Афіцыйны ж Кіеў настойвае на тым, што асобы, арыштаваныя за межамі Данецкай і Луганскай абласцей ніякага дачынення да гэтага пункта пратакола не маюць.

Нядзіўна і тое, што стральба ў месцах ваенных дзеянняў не спыняецца цалкам. З-за канцэнтрацыі велізарнай колькасці ўзброеных людзей, у тым ліку ўлічваючы несістэмную падпарадкаванасць атрадаў з абодвух бакоў, цяжка пазбегнуць новых правакацый, якія могуць рэзка ўскладніць сітуацыю.

Адной з галоўных праблем з'яўляецца няяснасць з планамі тых, хто аказвае моцны ўплыў на дзеянні Кіева. Многіх збянтэжыла тое, што на праведзеных на працягу апошняга тыдня перамовах у Мінску рознага ўзроўню адсутнічалі афіцыйныя прадстаўнікі ЗША, хаця ўсім вядома, што яны адыгрываюць значную ролю ў падзеі ва Украіне.

> **Надзеі дадае і пункт, у адпаведнасці з якім павінен быць прыняты закон аб недапушчэнні пераследу і пакарання асоб «у сувязі з падзеямі, якія мелі месца ў асобных раёнах Данецкай і Луганскай абласцей Украіны».**

У той жа час пра пазіцыю ЗША можна меркаваць па сумесных вучэннях Украіны з войскамі НАТА, дзе амерыканцы традыцыйна дамінуюць, ажыццяўляючы большасць ваенных расходаў. Уяўляецца, што ваенныя вучэнні такога роду ў краіне, якая ваюе, з'яўляюцца не самай лепшай ідэяй: улічваючы нервовую рэакцыю Расіі на НАТА, гэта не дапаможа знізіць напружанасць у рэгіёне.

У сувязі з гэтым і іншымі фактамі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў у інтэрв'ю вядучаму праграмы «Весткі ў суботу» на тэлеканале «Расія-1» аб дачыненні ЗША да канфлікту ва Украіне: «У чыіх гэта інтарэсах? Вам тлумачыць не трэба. І ўжо не ў інтарэсах еўрапейцаў. Гэта «дзядзька Сэм» з-за акіяна пастаянна падштурхоўвае нас да гэтай бойні...».

Яшчэ адным момантам для трывогі з'яўляюцца сур'ёзныя супярэчнасці паміж самімі паўстанцамі наконт будучага статусу дзвюх абласцей і межаў тэрыторыі, якія кантралююцца імі. Ад іх прадстаўнікоў рознага ўзроўню ідуць супярэчлівыя заявы як пра гатоўнасць застацца на асаблівых правах у складзе Украіны, так і аб немагчымасці падобнага сцэнарыя і ініцыяванні поўнага выхаду са складу краіны.

Асцярожны аптымізм выклікаюць пункты ў пратаколе перамоў, у якіх гаворыцца аб дэцэнтралізацыі ўлады шляхам прыняцця закона Украіны «Аб часовым парадку мясцовага самакіравання ў асобных раёнах Данецкай і Луганскай абласцей» і аб наступным правядзенні датэрміновых мясцовых выбараў у гэтым рэгіёне. Гэта ўжо сапраўды падобна на мірны сцэнарый, які можа быць рэалізаваны пры поўнай зацікаўленасці бакоў.

Надзеі дадае і пункт, у адпаведнасці з якім павінен быць прыняты закон аб недапушчэнні пераследу і пакарання асоб «у сувязі з падзеямі, якія мелі месца ў асобных раёнах Данецкай і Луганскай абласцей Украіны». Ён, як і папярэднія, азначае як прызнанне вярхоўнай юрысдыкцыі Кіева, так і стварэнне сапраўды спрыяльных абставін для мірнага ўрэгулявання супрацьстаяння, паколькі без такой гарантыі раззброіцца апалчэнцам не з рукі.

Некаторыя падставы для поспеху прынятага ў Мінску плана ўрэгулявання дае і актывізацыя дзейнасці АБСЕ. У нядзелю дзейны старшыня АБСЕ, прэзідэнт Швейцарыі Дзідзье Буркхальтэр заявіў: «Назіральная місія ва Украіне стварыла механізм для разбору выпадкаў парушэння рэжыму спынення агню. Ён будзе дапрацаваны ў супрацоўніцтве з бакамі на працягу бліжэйшых дзён і гадзін».

Вядома, АБСЕ, на жаль, не мае неабходнага статусу для прымусу да міру бакоў у выпадку парушэння імі заключанага пагаднення, але ўсё ж пасрэдніцтва такога роду зараз неабходна ў першую чаргу.

Хочацца спадзявацца, што абодва бакі досыць знясіленыя ў выніку доўгага супрацьстаяння, каб праявіць разважлівасць і не падарваць такі няўстойлівы мір у рэгіёне. Ім неабходна звярнуцца ў першую чаргу да сур'ёзных праблем у эканоміцы напярэдадні надыходзячай зімы і нарастальнага эканамічнага спаду ў краіне.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук** ■

# АСВЕТА ЯК ТРЫУМФАТАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тут і там чуліся падрабязнасці гісторыі, што адбылася больш як тысячу гадоў таму, калі хлопчык Ізяслаў абараніў сваю маці княгіню Рагнеду ад нажа Уладзіміра. Кіеўскага князя як бы і апраўдваюць: маўляў, Уладзімір узяў нож дзеля звычаю таго часу. Трэба было паставіць жонку на месца (на ўжо адведзенае месца ў царстве Аіда), бо Рагнеда, сілай узятая ў жонкі, падняла нож над мужам першай. Уладзімір Святаславіч выслаў маці з сынам у спецыяльна пабудаваную абарончую крэпасць, вакол якой пасля вырас горад, які стаў адным з цэнтраў беларускай дзяржаўнасці. А сам Ізяслаў за распаўсюджванне асветы на сваіх землях атрымаў мянушку Кніжнік.

Зусім невыпадкова ў гэты горад ужо ў XXI стагоддзі з'ехаліся пісьменнікі, перакладчыкі, журналісты, кнігавыдаўцы — усе, хто мае справу з друкаваным словам, і іх чытачы.



Міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ, абыходзячы гандлёвыя рады, паспрабаваў сябе ў якасці каваля.

Але мы забеглі наперад: яшчэ да адкрыцця помніка і ўрачыстага адкрыцця свята з раніцы горад неверагодна ажывіўся (а па сведчаннях месцічаў у звычайны час Заслаўе, мабыць, пад шатамі высакароднасці багатай гісторыі, ціхае і спакойнае).

Народныя ўмельцы, спевакі, танцоры, «зубры» сабраліся на галоўнай вуліцы горада і ў яе ваколіцах. Плюшавы «зубр» быў адным з лепшых відовішчаў, яго «блатная» хада выдавала ўсведамленне свайго дамінавання (па-мойму, ён мацней заганарыўся пасля чэмпіянату свету), таму ён заўсёды паблажліва дазваляў з сабой сфатаграфавацца.

Адчуванне свята стваралі некалькі сцэнічных пляцовак, з якіх раздавалася фальклорная і эстрадная музыка, на якіх энергічна або спакойна танцавалі, з якіх можна было пачуць рамантычную, пафасную, эпічную паэзію.

Без перабольшання можна сказаць, што самай вялікай папулярнасцю карыстаўся (і быў гэтага варты) праект Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага» (сумесны з газетай «СБ. Беларусь сегодня» і Выдавецкім домам «Звязда»). Гісторык, публіцыст і калекцыянер у свой час доўга вывучаў старадаўнюю літаратуру і гравюры, тэхніку старога друку, ездзіў па еўрапейскіх музеях, каб першым у свеце ўзнавіць Біблію па тэхналогіі, якой карыстаўся Францыск Скарына. «Факсімільнае выданне можа зрабіць кожны чалавек, яно не будзе ўнікальным. А вось зрабіць кнігу па тэхналогіі XVI стагоддзя — гэта ўжо нечага варта»,— каментуе Уладзімір Аляксеевіч. Цыкл стварэння друкаванай старонкі са скарынаўскай Бібліі можна было не толькі ўбачыць у адным з павільёнаў, але і самому ў гэтым паўдзельнічаць. На вачах у гасцей свята з цэлюлозы рабіліся лісты паперы, якія затым адпраўляліся на друкаваны станок. Іх было два:



Экспазіцыя арыгіналаў агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну!» у павільёне Выдавецкага дома «Звязда» выклікала ў наведвальнікаў шчырую зацікаўленасць.

афортны і той самы, створаны Уладзімірам Ліхадзедавым па ўзоры XVI стагоддзя. «Можна сказаць, на такім друкаваў Скарына,— кажа гісторык.— Прадстаўнікі музея кнігадрукавання Лейпцыга і Беластоцкага музея ацанілі і сказалі, што наш станок лепшы ў Еўропе. А адноўленых дзейных друкаваных станкоў гэтага стагоддзя — адзінкі. Мы аддрукавалі сем асобнікаў Бібліі Францыска Скарыны, для чаго рабілі паперу з лёну, таму кніга не адрозніваецца ад сапраўднай. Упершыню ў свеце быў праведзены ўвесь цыкл стварэння скарынаўскай Бібліі і выканана тэхналогія таго часу. Мы рабілі ўсё так, як рабіў першадрукар, нават аўтэнтычны папяровы пераплёт. А каб кніга больш жыва выглядала, мой сябар Барыс Цітовіч (вядомы мастак) распісаў тры асобнікі паводле скарынаўскіх гравюр».

Гэтыя асобнікі аддрукаванай на ўнікальным станку Бібліі былі прадстаўлены наведвальнікам экспазіцыі. Увогуле за два дні свята было зроблена больш за тысячу лістоў паперы і больш за тысячу адбіткаў. Павільён наведала каля дзвюх тысяч чалавек. У рамках выставы Уладзімір Ліхадзедаў змясціў таксама фотаздымкі вядомых месцаў горада Мінска, канца XIX, пачатку і сярэдзіны XX стагоддзя. «Я стараюся збіраць беларускую спадчыну і вяртаць яе дадому»,— тлумачыць калекцыянер сваё захапленне.

Шматлюддзе і шматгалоссе было і вакол крамак, арганізаваных цэнтрамі творчасці або прадстаўнікамі адукацыйных устаноў. Напрыклад, у дзіцячым парку культуры і адпачынку (цырымонія адкрыцця якога таксама адбылася ў святочны дзень) з мальбертамі размясціліся выхаванцы народнай дзіцячай студыі «Вясёлка» Стаўбцоўскага цэнтра дзяцей і моладзі, якія рабілі малюнкі на гістарычныя тэмы ў гонар Дня пісьменства.

Тут жа недалёка была ўсталявана выстаўка вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Бабулін куфэрак» ад Салігорскага педагагічнага каледжа. «Тут і прадметы даўніны з этнаграфічнага кутка, і тое, што зроблена рукамі нашых навучэнцаў для таго, каб захаваць традыцыі. Гэта і саломапляценне, і лозапляценне, і габелен»,— распавядае намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Людміла Бузун.

На вуліцы Савецкай ад стэндаў з сувенірамі адцягвалі ўвагу трое мужчын у традыцыйных касцюмах (як у ілюстраваных кнігах дзіцячых казак), якія з запалам і душой спявалі народныя і эстрадныя песні: хоць пускайся ў скокі. Пакуль спевакі адпачывалі, даведалася, што яны прадстаўляюць цэнтр рамёстваў Старых Дарог. Яны атрымлівалі сапраўднае задавальненне ад свайго выступу і шчыра ўсміхаліся мінакам.

Шмат майстроў прывезлі ў Заслаўе вынікі сваёй працы. Тут і вязаныя рэчы (напрыклад, вельмі каларытныя шкарпэткі), і вышытыя, і вырабы з дрэва (на вачах у гледачоў майстар сякеркай зрабіў з палена лыжку), і прадметы інтэр'ера ў тэхніцы «роспіс па шкле», і ўпрыгажэнні, і магніцікі з нацыянальным каларытам на лядоўню — карацей, дробязі і далёка не дробязі.

Там, адкуль даносіліся духмяныя пахі, можна было знайсці не толькі традыцыйныя збіцень, медавуху і парася на ражне, але і шашлыкі, фрэнч-догі і чэшскія трубачкі. У парку дзіцячай культуры і адпачынку на кожным кроку прадаваліся яркія цацкі, што прымушала малых перыядычна торгаць бацькоў за рукаў.

І ўсё ж галоўным на гэтым святе, як і належыць, было Слова. У «інтэлектуальнай» частцы былі прадстаўленыя беларускія перыядычныя выданні і рэгіянальныя выданні Мінскай вобласці (што прымусіла іх прадстаўнікоў з раніцы напячы караваяў, надзьмуць шарыкі, аформіць стэнды сваімі друкаванымі вырабамі і па-братэрску з усімі гэтым дзяліцца).



Эстафету Дня беларускага пісьменства ад старшыні Заслаўскага гарвыканкама Святланы КАРТАШОВАЙ прыняў старшыня Шчучынскага райвыканкама Сяргей ЛОЖАЧНІК.

Стэнд Выдавецкага дома «Звязда» з усёй разнастайнасцю сваіх праектаў не мог не прывабіць мінакоў. Таму віталі, цікавіліся, чыталі. Таццяна Захарыч, кіраўнік калектыву аўтарскай песні «Элегія» з Вілейкі, які наладзіў на цэнтральнай сцэне прэзентацыю выдавецкага дома, лічыць, што выданні «Звязды» робяць патрэбную справу: «Мы любім спяваць на беларускай мове, папулярызуючы беларускую паэзію і аўтарскую песню, таму і калектыву «Звязды» зычым творчых здабыткаў, натхнення, і каб роднае слова гучала з большай сілай».

Прыцягвала ўвагу на стэндзе «Звязды» і выстаўка арыгіналаў сатырычнага лістка «Раздавім фашысцкую гадзіну!» (таксама з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава). Гэты агітлісток можна лічыць прашчурам сучаснага часопіса «Вожык».

Акрамя таго, на Дні пісьменства была магчымасць убачыць агульную карціну кніжнай прадукцыі беларускіх выдавецтваў. А паказаны быў увесь спектр літаратуры: ад навуковай, даследчай да мастацкай. Да таго ж кнігі можна было набыць (і іх набывалі).

На пляцоўцы «Літаратурная кавярня» за кубкам гарачай гарбаты можна было прасякнуцца добрай паэзіяй. Два дні са сцэны чуліся лірычныя творы ад саміх аўтараў. Дарэчы, увагу публікі ўпэўнена ўтрымліваў сучасны паэт і празаік, аўтар песень (ён яшчэ і супрацоўнік нашай газеты), рамантык і сентыменталіст Дзмітрый Пятровіч, які падчас Дня беларускага пісьменства прадставіў сваю новую кнігу «Адзіноты пажоўклыя дні».

Свята таксама знамянальнае сёмай цырымоніяй ушанавання пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор года, якая адбылася на галоўнай пляцоўцы Дня пісьменства. Заснавальнікамі конкурсу з'яўляюцца Саюз пісьменнікаў Беларусі, Міністэрствы інфармацыі, культуры і адукацыі і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Лаўрэаты размеркаваліся па некалькіх намінацыях, сярод якіх паэзія, проза, публіцыстыка, крытыка і літаратуразнаўства, драматургія і дзіцячая літаратура, краязнаўства, сатыра і гумар і іншыя. У намінацыі «Проза» першае месца атрымаў пісьменнік Алесь Савіцкі, у намінацыі «Паэзія» — Аляксандр Быкаў, а наша калега, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Таццяна Сівец стала ўладальніцай «Купідона» ў намінацыі «Дзіцячая літаратура».

На цырымоніі закрыцця Дня пісьменства эстафета правядзення свята была перададзена гораду Шчучын Гродзенскай вобласці, адкуль родам першая беларуская паэтка Алаіза Пашкевіч (Цётка). Але для Заслаўя, здаецца, свята яшчэ не скончылася.

Ізяслаў не проста быў героем размоў: у суботу адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка князю, і цяпер заснавальнік горада ў бронзе назаўжды застанецца на Цэнтральнай плошчы як захавальнік і сімвал Заслаўя.

Старшыня Заслаўскага гарвыканкама Святлана Карташова на цырымоніі адкрыцця выказала словы падзякі «тым кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый, якія па кроплі ўносілі свой уклад у тое, каб помнік сёння ў нас быў». Святлана Пятроўна з недвухсэнсоўным намёкам дадала: «І дзякуй тым, хто сваю асабістую зарплату, Анатоль Афанасьевіч, накіроўваў на выраб помніка» (на адкрыцці прысутнічаў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік).

Урачыстая цырымонія адкрыцця Дня беларускага пісьменства адбылася ўвечары на Гарадскім вале, ля славутай старажытнай царквы. Удзельнікаў і гасцей свята віталі першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў, які зачытаў віншаванне Прэзідэнта, віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік, які ўжо не першы год узначальвае Нацыянальны аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні свята, епіскап Барысаўскі Веньямін, які агучыў прывітанне мітрапаліта Паўла, Патрыяршага экзарха Усяе Беларусі, старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён Шапіра.



Паводле задумкі скульптара Аляксандра Прохарава, у адной руцэ князя Ізяслава меч, у другой — кніга.



Гурт «Элегія» з Вілейкі аздобіў прэзентацыю Выдавецкага дома «Звязда» прыгожымі песнямі на роднай мове.



Удзельнікі экспедыцыі «Дарога да святыняў» па традыцыі заклалі ў Заслаўі сад Малітвы.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# Жыць па законах таленту

## ПРА ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС, БЛОГЕРСТВА І ІДЭАЛЫ

**Якое месца займае пісьменнік у сучасным свеце? Ці дастаткова ў яго сродкаў для папулярызацыі ўласнай творчасці і якія крыніцы заробку ён мае? Ці павінна дзяржава прымаць непасрэдны ўдзел у літаратурным працэсе? Гэтыя і многія іншыя пытанні былі абмеркаваны на міжнародным «круглым стале» пад назвай «Сугучча. Літаратура як люстэрка эпохі», які ладзіўся падчас свята беларускага пісьменства.**

Арганізатарамі дзеі выступілі Міністэрства інфармацыі Беларусі, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда» і Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Апошняя, дарэчы, і стала той пляцоўкай, на якой адбывалася сустрэча літаратараў з Беларусі, Расіі, Літвы, Казахстана, Малдавіі, Таджыкістана і іншых краін.

«Круглы стол» праводзіўся восьмы раз. Вітальнае слова да ўдзельнікаў накіраваў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй КАБЯКОЎ.** У ім гаварылася пра тое, што наша дзяржава падтрымлівае развіццё айчыннай літаратуры, а таксама міжкультурны дыялог і гуманітарнае ўзаемадзеянне народаў розных краін. «Слова пісьменніка, таленавітыя творы класікаў і сучасных аўтараў павінны аб'ядноўваць людзей на аснове маральных ідэалаў. І вельмі важна, што «круглы стол» «Сугучча» робіць свой унёсак ва ўзаемаўзбагачэнне нацыянальных літаратур», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр РАДЗЬКОЎ,** які прыняў удзел у рабоце «круглага стала», падзяліўся ўласнымі разважаннямі аб пакліканні пісьменніка і яго месцы ў грамадстве:

— Сустрэча прадстаўнікоў пісьменніцкага згуртавання — надзвычай важная падзея. Бо грамадству вельмі патрэбны мудрацы. Іх па-рознаму можна называць: жыхары, філосафы, пісьменнікі. Але без гэтай мудрасці няма паўнаты адчування жыцця, няма развіцця цывілізацыі. Бо на любым этапе гісторыі трэба асэнсоўваць, адкуль мы, што мы сабой уяўляем і як нам далей рухацца... Вывучаць жыццё, да таго ж ацэньваць яго і рабіць прадбачанні — гэта надзвычай складаная задача. Для таго, каб яе выканаць, трэба апускацца на глыбіню. Аднак запатрабаванасць у гэтым надзвычай вялікая... Па ініцыятыве Прэзідэнта мы арганізавалі паездку пісьменнікаў па краіне. Там, на месцах, мы ўбачылі, наколькі людзям неабходны кантакт з творцам, бо нават разумнаму чалавеку важна зверыць свае думкі: «Ці правільна я дзейнічаю, ці правільна думаю?..» А калі да іх прыходзіць сапраўдны «жрэц» — пісьменнік, яны ўважліва слухаюць яго, а таксама па вачах правяраюць, ці верыць ён сам у тое, пра што гаворыць, ці жыве так?..




Актыўны ўдзел у дыскусіі прынялі Ато ХАМДАМ (Таджыкістан), Валерый КАЗАКОЎ (Расія), Ярон ЛАЎЦЮС (Літва).

Тэму важкасці пісьменніцкай справы падтрымала і **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** Яна ўжо не першы раз прысутнічала на такой сустрэчы літаратараў, таму магла грунтоўна ацэньваць тое, што ўжо зроблена, а таксама строіць планы на бліжэйшую будучыню:

— Вельмі прыемна бачыць знаёмыя твары, бо ўжо восьмы раз Беларусь збірае міжнародны «круглы стол» літаратараў краін СНД, блізкага і далёкага замежжа. Мы бачым, што такія абмены духоўна-маральнымі каштоўнасцямі ўмацоўваюць нашу культурную прастору. 21-ы год у краіне праводзіцца Дзень пісьменства — гэта амаль столькі ж, колькі незалежнай Беларусі. Такая адпаведнасць яскрава падкрэслівае кірунак дзяржавы на ўмацаванне духоўнасці і маральнасці, развіццё інтэлектуальнага, творчага патэнцыялу нашага грамадства. У 2017 годзе мы будзем адзначаць 500-годдзе айчыннага кнігадрукавання, што чарговы раз адлюструе тую вялікую ўвагу, якая ў нашай краіне надаецца падтрымцы кнігавыдання.

Як бачым, нашы кніжныя паліцы ў бліжэйшы час яшчэ папоўняцца. Радуе і тое, што ёсць магчымасць на свае вочы ўбачыць многіх нашых аўтараў. Аб працы творцаў на месцах расказваў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ:**

— У нас у саюзе больш за 650 членаў. Вядома, не ўсе яны ззяюць на аднолькава высокім узроўні — як розныя футбалісты ў адной камандзе. За год нашы аўтары выступаюць перад чытачамі ад 15 да 20 тысяч разоў, і гэта вельмі радуе... Неяк Прэзідэнт звярнуўся да нас: «Пісьменнікі, вас мала відаць у інтэрнэце». Мы аператыўна адрэагавалі на гэту заўвагу: за 2,5 года колькасць пісьменнікаў-блогераў павялічылася з 15 да 200.

На «круглым стале» шмат гаварылася і пра найвышэйшае пакліканне пісьменніка, яго асаблівую адказнасць перад усім народам. Асабліва хвалявала гэта вядомага **расійскага журналіста, пісьменніка, выдаўца, грамадскага дзеяча Рыгора ПРАХІНА:**



Сваімі развагамі аб сучасным літаратурным працэсе дзеліцца Аляксандр КАЗІНЦАЎ (Расія).

— Што датычыцца літаратуры і яе ролі перад народам, мне здаецца, тут стаяць дзве задачы. Першая — служыць не інстынктам, а ідэалам, у тым ліку міру і добрасуседству. Другая — служыць слову, роднаму слову, якое часта знаходзіцца пад уціскам і нівеліруецца, бо без яго і нас саміх не стане... Мы выдалі некалькі тамоў дзівоснага беларускага фальклору. Некаторыя рэчы ўпершыню былі перакладзены на рускую мову, і я быў проста ўражаны, наколькі яны вострыя, цудоўныя — проста алмаз.

Наступныя выступоўцы шмат казалі пра асаблівую ролю Беларусі на міжнароднай, не толькі літаратурнай, але і агульначалавечай прасторы. **Пісьменнік, старшыня федэратыўнай нацыянальнай культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Валерый КАЗАКОЎ** яшчэ раз нагадаў пра славутае міралюбства беларусаў:

— Сёння кожны чалавек, які разважае, і не толькі пісьменнік, павінен вызначыць, з кім ён: або з сіламі цемры, або з сіламі святла. Нас шмат што раз'ядноўвае: мовы, рэлігіі, колер скуры, перакананні — аднак ёсць адно, што падымае нас над усім і вакол чаго можна гуртавацца — гэта талент пісьменніка. Дзякуй Богу, што ёсць беларусы. Я кажу гэта цалкам сур'ёзна — як салдат, як афіцэр. Бо за час незалежнасці Беларусі ніводзін салдат гэтай краіны не ўдзельнічаў ні ў адной вайне. Я лічу, што Беларусь — гэта апошняя крыніца з рук Бога, што датычыцца і літаратуры. У Расіі, як і ў іншых краінах, такія пасяджэнні не праводзяцца. Беларусь захавала такую практыку, калі пісьменнікі прыязджаюць у розныя калектывы — ад дзіцячага садка да будаўнічай пляцоўкі — і ладзяць сустрэчы-чытанні. Нідзе на постсавецкай прасторы няма такой формы працы.

Азербайджанец **Чынгіз Алі аглу** салідарны з расійскім калегам у поглядах на наш народ:

— Лёс усклаў на Беларусь і яе народ асаблівую місію — быць тым становым цэнтрам, які накіроўваў бы нас на служэнне чалавеку. Прарок прамаўляе тое, што пачуў звыш. А вось пасля прарокаў ідуць паэты (пад паэтамі маюцца на ўвазе ўсе творчыя асобы). Паэты і пісьменнікі абавязаны прыслухоўвацца да голасу ўласнага сумлення, чалавечай годнасці. Яны павінны найперш кіравацца сваім прызначэннем, жыць па законах таленту.



Хасан ТХАЗЁПЛАЎ (Кабардзіна-Балкарыя) прапанаваў зрабіць «Залатога арла» сімвалам міжнароднага «круглага стала». Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр РАДЗЬКОЎ і міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ ідэю госця падтрымалі.

Разважалі на «круглым стале» і пра якасць сучаснай літаратуры. Найперш павёў гутарку ў гэтым рэчышчы мадэратар пасяджэння, **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.** Ён звярнуў увагу на тое, што да чытача сёння часта трапляе масавая літаратура. Магчыма, чалавецтва стамілася, мяркуе ён, раз карыстаецца, у тым ліку праз слова, пэўнымі сімваламі, якія даюць магчымасць проста адпачыць. Такім чынам мы пазбаўляем працы і наша сэрца, і розум.

Пра тое, што ў літаратурным працэсе сёння многае змянілася, гаварыў і **празаік, галоўны рэдактар «Раман-газеты» Юрый КАЗЛОЎ:**

— «Роман-газета» сёння, як і калісьці, выходзіць два разы на месяц. Таксама раз на месяц выходзіць дзіцячы выпуск. На прыкладзе «Роман-газеты» можна прасачыць усё тое, што адбылося з літаратурай. У мінулыя часы наклад даходзіў да 4-х мільёнаў экземпляраў. Цяпер ён складае ўсяго 4 тысячы. Такім чынам, па аналогіі, можна лічыць, што ў тысячу разоў скарацілася літаратурная прастора... Мне здаецца, Беларусь у справе выстройвання адносін паміж пісьменнікам і дзяржавай значна апярэджвае ўсе іншыя дзяржавы СНД. Хаця прэстыж прафесіі пісьменніка ўвогуле катастрафічна ўпаў. Думаю, ніхто з прысутных не жыве літаратурнай працай. Усе мы вымушаны падпрацоўваць, займацца журналістыкай ці нечым яшчэ. Таму вельмі важна, каб дзяржава дапамагала пісьменніку жыць з яго літаратурнай працы. А ўсе спасылкі на тое, што цяпер час рынку, што творы не прадаюцца, лічу надуманымі. Бо масавая літаратура, якая цяпер пануе, пішацца толькі з адной мэтай — атрымання прыбытку. У той жа час нармальную, яркую мастацкую прозу ніхто не імкнецца нават асэнсаваць.

Усе прысутныя ўхвалі канцэпцыю працы з пісьменнікамі, агучаную Казловым, якая існуе ў еўрапейскіх краінах:

— Там прытрымліваюцца думкі, што пакуль развіваецца мова, жывым сябе можа лічыць і народ. А пісьменнікі — гэта тыя людзі, якія якраз даюць магчымасць развівацца мове і самасвядомасці, і грамадства не дэградуе. У Еўропе лічыцца, што пісьменнік ужо выканаў сваю місію, калі стварыў адзін вобраз, адну метафару, адно яркае параўнанне, якое ўвойдзе ў скарбонку мовы. Нават калі больш ён нічога выдатнага не напіша, для яго будзе знойдзена добрая форма існавання: весці гурткі, чытаць лекцыі — у галечы ён не будзе. Можна было б і нам узяць на ўзбраенне такую форму працы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

**Фотаздымкі Надзеі БУЖАН, Сяргея НІКАНОВІЧА і Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

■ Жыллё маё

# ПАЖЫЎ, ПРЫВАТЫЗАВАЎ, ПРАДАЎ... І З'ЕХАЎ З ВЁСКІ

## Дамы ў аграгарадках становяцца прадметам спекуляцыі


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА распарадзіўся прыпыніць прыватызацыю і продаж жылля ў Слуцкім раёне. Гэта датычыцца менавіта тых дамоў, што пабудаваны ў аграгарадках за дзяржаўныя сродкі па праграме адраджэння і развіцця сяла, ці, як іх празвалі ў народзе, «прэзідэнцкіх» домікаў.**

Да такога рашэння кіраўніка вобласці падштурхнулі канкрэтныя факты, што выявіліся падчас выязнога прыёму грамадзян у Слуцкім раёне.

У прыватнасці, да Сямёна Шапіры звярнулася Надзея Абушэнка. Яе сын працаваў у адкрытым акцыянерным таварыстве «Казловічы-Агра» бухгалтарам. Спецыялісту выдзелілі дом, куды пераехалі і маці з бацькам. Пасля звальнення сына іх папрасілі вызваліць памяшканне, бо кіраўнік гаспадаркі не дае дазвол на заключэнне дагавора найму. Жанчына ж хоча застацца ў доме. Яна матывавала сваю просьбу тым, што працуе ў сельскагаспадарчай навучальнай установе, якая рыхтуе кадры для аграпрамысловага комплексу. Надзея Леанідаўна прасіла пасадзейнічаць у вырашэнні пытання: яна нават гатова перайсці на працу па сваёй спецыяльнасці ў гаспадарку.

**Не назіральныя саветы гаспадарак распараджаюцца дзяржаўнай маёмасцю і прымаюць рашэнне: каму дазволіць выкупіць дом, а каму не. Апошняе слова павінна быць за кіраўніком сельгаспрадпрыемства, які адказвае за ўсе аспекты жыццядзейнасці на даручаным ім участку.**

Андрэй Скрундзік — механізатар таго ж таварыства «Казловічы-Агра». За прыватызацыю дома (агульнай плошчай крыху больш за 60 квадратных метраў) яму трэба заплаціць 140 млн рублёў. Здавалася б, па сённяшніх цэнах грошы невялікія. Але ён патрабуе ў гаспадаркі льготы на пакупку жылля. Па словах Андрэя Іванавіча, непадалёку знаходзіцца значна лепшы па спажывецкіх якасцях і большы па памерах дом, які ацанілі практычна ў такую ж суму.

Слуцкі племптушказавод адмаўляе ў прыватызацыі службовай кватэры Марыі Анісімавай. На пытанне: «Навошта вам прыватызаваць жыллё? Жывіце спакойна, вас ніхто адтуль не выганяе», у Марыі Цімафееўны знайшоўся адказ: «Хачу пакінуць дзецям».

Хоча пакінуць свой дом унуку і Рыта Смірнова, якая працавала ў гэтай жа арганізацыі разам з мужам і сынам. Сям'я пераехала сюды з Мурманска ў 90-я гады мінулага стагоддзя. Спачатку здымалі кватэру. Затым кіраўніцтва прадпрыемства дапамагло вырашыць жыллёвае пытанне: узяло крэдыт на пакупку жылля ў памеры 5 млн рублёў. Акрамя таго, як сцвярджае Рыта Сцяпанаўна, яна даплаціла яшчэ і свае 2 млн рублёў, каб набыць жылплошчу. Давялося шмат папрацаваць ды патраціцца матэрыяльна, каб давесці яе да ладу. «Чаму мне не дазваляюць выкупіць дом, калі ў яго ўкладзена трэць асабістых сродкаў?» — не разумее жанчына.

Ёй растлумачылі: калі прадпрыемства ўзяло крэдыт на набыццё дома для сваіх работнікаў, то яно па заканадаўстве абавязана было паставіць яго на свой баланс. А што тычыцца вуснай дамоўленасці з былым уласнікам завода, то яе да справы не падшыеш. Гэта проста словы. Заяўніцы параілі звярнуцца ў суд.

Механізатар Аляксандр Леванкоў прыйшоў на прыём з жонкай. Яны пераехалі ў ААТ «Вясейскі Пакроў» з суседняга раёна, ім далі жыллё. «Нам абяцалі дазволіць выкупіць дом пасля пяці гадоў працы. Затым змянілі рашэнне — толькі праз 10 гадоў», — паскардзіліся сужэнцы. Па словах старшыні адкрытага акцыянернага таварыства Людмілы Савановіч , яны адпрацавалі ў гаспадарцы толькі 8 гадоў і пакуль што не маюць права на прыватызацыю жылля. Аднак сямейная пара спасылалася на тое, што многія на іх вуліцы прыватызавалі жыллё, прадалі яго і звольніліся. Так сцвярджалі і іншыя наведнікі.

Гэтыя дамы будаваліся не дзеля нейкай прыхамаці, а для таго, каб вырашыць кадравую праблему на вёсцы, прыцягнуць спецыялістаў. Не толькі механізатараў, даярак, заатэхнікаў, ветурачоў, аграномаў, але і медыкаў, культработнікаў, настаўнікаў. Такое добраўпарадкаванае жыллё, можна сказаць, абыходзіцца людзям амаль бясплатна. Крэдыты, узятыя ў банках на іх будаўніцтва, сельгаспрадпрыемствы пагашаюць са сваіх даходаў. Жыльцы ж уносяць толькі невялікую плату за камунальныя паслугі. Ды многіх такі стан рэчаў не задавальняе — яны хочуць быць уласнікамі незалежна ад таго, колькі адпрацавалі ў гаспадарцы. Імкненне быць гаспадаром свайго дома, бясспрэчна, добрае. Але ж, як паказвае практыка, пасля прыватызацыі некаторыя забываюць пра гэта. Прадаюць дамы ўтрая даражэй, чым выкупілі, і ўцякаюць хто куды: нехта ў горад, а хтосьці ў іншы аграгарадок, каб атрымаць яшчэ адзін катэдж і, магчыма, праз пэўны час зноў прадаць. А тым часам усё менш становіцца свабоднага жылля для маладых спецыялістаў, якія прыязджаюць на іх месца па размеркаванні. А будаўніцтва аднаго новага дома сёння абыходзіцца гаспадарцы больш як у мільярд рублёў.

Як заўважыў Сямён Шапіра, такіх пытанняў не ўзнікае ў аддаленых раёнах, тых жа Старых Дарогах, Крупках. Звычайна павышаны ажыятаж на выкуп толькі ў прамысловых гарадах — такіх як Слуцк. Гэта і зразумела, тут рыначны кошт зямлі, нерухомасці значна вышэйшы. Можна добра зарабіць на розніцы паміж цаной прыватызацыі і магчымага продажу.

— З гэтага моманту выкупляць жыллё ў аграгарадках можна будзе толькі з маёй асабістай згоды. І толькі за асаблівыя заслугі — людзям, якія адпрацавалі ў гаспадарках 40 гадоў. Недапушчальна разбазарваць яго сябрам ці знаёмым, — падкрэсліў Сямён Шапіра.

Ад старшыні ААТ «Казловічы-Агра» ён запатрабаваў падаць яму звесткі: колькі дамоў прададзена, каму і па якой цане. Сямён Шапіра нагадаў таксама, што не назіральныя саветы гаспадарак распараджаюцца дзяржаўнай маёмасцю і прымаюць рашэнне: каму дазволіць выкупіць дом, а каму не. Апошняе слова павінна быць за кіраўніком сельгаспрадпрыемства, які адказвае за ўсе аспекты жыццядзейнасці на даручаным ім участку. Раздаваць дзяржаўную маёмасць амаль бясплатна — недазвольная раскоша.

Дадам, што некаторыя заяўнікі імкнуцца прыватызаваць жылплошчу, бо баяцца, што ў выпадку непрадбачаных абставін — смерці, хваробы наймальніка жылля — іх проста выкінуць на вуліцу. Гэтыя страхі развеяў старшыня Мінаблвыканкама. «Гарантую, што ніхто вас не выселіць з дома, жывіце спакойна, працуйце», — сказаў ён.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Спажывец

# ІМПАРТ СВІНІНЫ СКАРАЧАЕЦЦА

## Гэта паўплывае не толькі на ўнутраны рынак...

**Сітуацыя звязана з узмацненнем уплыву АЧС (афрыканскай чумы свіней) на свіное пагалоўе бліжэйшых краін. Так, у пачатку чэрвеня была ўведзена забарона на пастаўку свініны з Польшчы. Нагодай сталі новыя ўспышкі чумы, якія зарэгістравалі на тэрыторыі Падляскага ваяводства. У канцы жніўня новыя выпадкі АЧС былі выяўлены ў Смаленскай вобласці Расіі, адкуль таксама забаранілі часова імпарт свініны. З 2 верасня Беларусь увяла часовыя абмежаванні на ўвоз свініны з Чарнігаўскай вобласці Украіны.**

Да ўвозу не дапускаюць жывых свіней, свініну, у тым ліку мяса дзікоў, прадукты перапрацоўкі, гарбарную, рогакапытную і кішачную сыравіну, шчацінне, паляўнічыя трафеі, атрыманыя ад успрымальных відаў жывёл, корм, выраблены з сыравіны, якая паходзіць з гэтых рэгіёнаў і не прайшла тэрмічную апрацоўку. Забарона таксама распаўсюджваецца на абсталяванне, якое ўжывалася для ўтрымання, забою і разбірання свіней.

### Болей сыравіны — болей паставак

У канцы жніўня Еўразійская эканамічная камісія зацвердзіла пералік тавараў, у дачыненні да якіх на 2015 год вызначаюцца тарыфныя квоты, а таксама аб'ёмы тарыфных квот для ўвозу гэтых тавараў на тэрыторыі дзяржаў — членаў Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. На свініну свежую, астуджаную ці замарожаную, а таксама на свіны трымінг для Беларусі вызначана квота ў 20 тыс. тон. Устаноўлена таксама, што ў выпадку, калі аб'-ём увозу свініны на тэрыторыю Беларусі ў рамках тарыфнай квоты на працягу першага паўгоддзя 2015 года складзе не менш 70% ад вызначанага аб'ёму, то гэтая тарыфная квота падлягае павелічэнню да 40 тыс. тон уключна.

Фактар распаўсюджання чумы, а таксама далейшае закрыццё межаў для імпарту могуць негатыўна паўплываць на ўвоз запланаваных аб'ёмаў свініны па тарыфных квотах.

Паводле звестак Белстата знешнегандлёвыя аперацыі з жывымі свіннямі за студзень—чэрвень 2013-га і 2014-га гадоў характарызуюцца адсутнасцю экспартных паставак на фоне павелічэння імпарту. Экспарт жывых свіней у першым паўгоддзі 2014 года не ажыццяўляўся. У студзені—чэрвені 2013-га такі экспарт склаў у натуральным выражэнні 4881 тону, што эквівалентна 9,4 млн долараў. Імпарт жывых свіней у 2014 годзе ў параўнанні з папярэднім годам павялічыўся на 0,5 млн долараў і склаў каля 1,4 млн. Імпартаваліся свінні з Францыі і Чэшскай Рэспублікі.

Знешнегандлёвыя аперацыі са свінінай за перыяд студзень—чэрвень 2013-га і 2014-га гадоў характарызуюцца рэзкім зніжэннем імпарту і экспартных паставак. Сёлета свініна ў асноўным завозілася з Малдовы, Расіі, Украіны, Бельгіі, Германіі, Даніі, Польшчы, Францыі, Чарнагорыі. Экспарт прыпадаўся на рынкі Казахстана і Расіі.


Фота БЕЛТА.

### У Беларусі вучацца працаваць ва ўмовах АЧС

Жывёлагадоўчыя прадпрыемствы Рэспублікі не чакаюць хуткага спынення АЧС. Таму асноўная задача для краіны — навучыцца працаваць ва ўмовах гэтай праблемы. **Генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра па жывёлагадоўлі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікалай ПАПКОЎ** мяркуе, што захады, якія прымаюцца на розных узроўнях, дадуць магчымасць у хуткім часе вярнуцца да аб'ёмаў вытворчасці свініны 2012 года.

Але ў гандлёвых сетках Беларусі ўжо цяпер назіраюцца часовыя перабоі з наяўнасцю на прылаўках мяса і курэй. Аднак сёння ёсць своечасовая рэакцыя з боку Мінгандлю і Мінэканомікі. «Мы пастаянна сігналізуем, як толькі пачынаюць з'яўляцца складанасці. Спадзяюся, што гэтае ўзаемадзеянне дазволіць трымаць харчовы рынак у нармальнай сітуацыі», — адзначыў **генеральны дырэктар гандлёвай сеткі «Еўраопт» Андрэй ЗУБКОЎ.**

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Факт

## Будуем у Расіі як дома?

**Айчынныя спецыялісты дамовіліся з Расіяй аб арганізацыі з першых дзён наступнага года адзінага рынку будаўнічых паслуг, каб беларускія будаўнічыя арганізацыі маглі спакойна працаваць на расійскім рынку, а расійскія — у Беларусі. Пра гэта паведаміў першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр КРУЧАНАЎ.**

Пасля стварэння такога рынку айчынным будкампаніям ужо не прыйдзецца атрымліваць дадатковыя дазволы на тэрыторыі суседняй дзяржавы, адзначыў першы намеснік міністра. Таксама бакі дамовіліся аб узаемным прызнанні кваліфікацыйнай атэстацыі. Такім чынам, прынцыповыя дамоўленасці па гэтым пытанні дасягнуты. Цяпер толькі трэба гарманізаваць адпаведную нарматыўную базу дзвюх краін. У сувязі з гэтым Мінбудархітэктуры налета плануе істотна павялічыць экспарт будаўнічых паслуг у Расію.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## «Летнія размовы» зацягнуцца... да канца восені

**Аператар мабільнай сувязі МТС працягнуў да канца восені акцыю «Летнія размовы», па якой абаненты пасля трох хвілін размоў у сетцы атрымліваюць бясплатны безліміт на размовы да канца сутак. З наступленнем новага дня пасля трох хвілін размоў абанент зноў атрымлівае магчымасць размаўляць бясплатна.**

Прапанову запусцілі ў пачатку лета і планавалі абмежавацца трыма месяцамі. Але ўлічваючы папулярнасць ініцыятывы сярод абанентаў, аператар вырашыў прадоўжыць тэрмін яе дзеяння да 30 лістапада. За летнія месяцы да безлімітных размоў падключыліся больш за мільён чалавек.

— Мы прааналізавалі актыўнасць абанентаў і ўбачылі, што людзі, якія падключыліся да акцыі «Летнія размовы», знаходзіліся на сувязі на 20% больш, чым раней. Пры гэтым іх выдаткі на сувязь не павялічыліся, — адзначыў кіраўнік дэпартамента маркетынгу МТС Дзяніс Цярэшчанка.

Акцыя распаўсюджваецца на большасць абанентаў аператара, якія карыстаюцца як новымі, так і архіўнымі тарыфнымі планамі. Актываваць безліміт можна самастойна ў любы дзень восені.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Збіць «градус» рэкламы

**Міністэрства гандлю адзначае рост парушэнняў, звязаных з рэкламай алкаголю.**

У апошні летні месяц было праверана звыш 130 аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання краіны, большая частка якіх — крамы крокавай даступнасці. Вынікам стала складанне больш за 230 пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Як паведамляе прэс-служба міністэрства, парушэнні былі ўстаноўлены ў кожным з правераных аб'ектаў. Сярод іх — рэалізацыя пратэрмінаваных тавараў, парушэнне ўмоў захоўвання прадуктаў харчавання, асартыментных пералікаў і г.д. Пры гэтым спецыялісты адзначаюць, што пачасціліся выпадкі рэкламы алкагольных напояў і піва, якія стымулююць набыццё гэтай прадукцыі. Такія парушэнні сустракаюцца як у невялікіх крамах, так і ў аб'ектах буйных гандлёвых сетак. Вінаватым службовым асобам пагражаюць штрафы да 100 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

Утерянный страховой полис «обязательное медицинское страхование» в количестве 1 штуки серии БВ № 2997695 представительства Белгосстраха по Минскому району считать недействительным.

*УНП 600013344*

■ спаДАРОЖНІК

## «МАЛЮЕМ» У БІЛЕЦЕ НІЖНЮЮ ПАЛІЦУ?

**Беларуская чыгунка пашырыла спіс цягнікоў, на якія можна набыць білеты праз інтэрнэт з выкарыстаннем графічнай схемы размяшчэння свабодных месцаў у вагоне. Нагадаем, што праз гэтую опцыю пасажыр мае магчымасць выбраць любое свабоднае месца, якое яму спадабалася — каля акна, у пачатку ці ў цэнтры салона. Паслуга ўпершыню была прэзентавана ў чэрвені, і пашырэнне спіса цягнікоў, у дачыненні да якіх яна будзе дзейнічаць, — працяг паэтапнага ўкаранення новых магчымасцяў для пасажыраў.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, у пералік цягнікоў, месцы ў якіх можна выбраць на сайце www.poezd.rw.by пры дапамозе графічнай схемы, уключаны цягнік міжнародных ліній №801/802 Мінск — Вільнюс, а таксама шэраг пяцівагонных саставаў рэгіянальных ліній бізнес-класа. Гэта цягнікі: № 732/731 Мінск — Орша, № 736/735 Мінск — Орша, № 742/741 Мінск — Жлобін, № 752/751 Баранавічы — Мінск, № 754/753 Баранавічы — Мінск, № 756/755 Баранавічы — Мінск, № 758/757 Баранавічы — Мінск, № 762/761 Брэст — Баранавічы, № 764/763 Брэст — Баранавічы, № 766/765 Брэст — Баранавічы.

Такім чынам, цяпер колькасць цягнікоў, білеты на якія можна набыць у інтэрнэце з выкарыстаннем вышэйназванай паслугі, павялічылася да 18 пар.

У цэлым анлайн-сістэма продажу праязных дакументаў Беларускай чыгункі працягвае набіраць папулярнасць: з пачатку года праз інтэрнэт было рэалізавана 629 тысяч білетаў на цягнікі, што перавысіла ўзровень аналагічнага перыяду мінулага года ў два разы. У тым ліку колькасць білетаў, аплачаных з паслугай электроннай рэгістрацыі (якая дазваляе не афармляць білет у касе), склала 514,5 тысячы і павялічылася ў 2,7 раза ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага года.

У чэрвені, калі паслуга з'явілася, опцыя выбару месца ў вагоне пры дапамозе графічнай схемы стала даступнай пры набыцці праз інтэрнэт білетаў на цягнікі міжнародных ліній №805/806 Мінск — Вільнюс і на цягнікі рэгіянальных ліній бізнес-класа: № 734/733 Мінск — Орша, № 738/737 Мінск — Орша, № 744/743 Мінск — Бабруйск, № 746/745 Мінск — Бабруйск, № 771/772 Мінск — Маладзечна, № 773/774 Мінск — Маладзечна.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТОРГРАЗВИТИЕ»!
**ПРИГЛАШАЕМ ВАС ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ ВО ВНЕОЧЕРЕДНОМ ОБЩЕМ СОБРАНИИ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ТОРГРАЗВИТИЕ»,**
***которое состоится 29 сентября 2014 г. в 11.00***
***по адресу: г. Минск, ул. Вильямса, 45, каб. № 23.***
Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.30.
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об уменьшении уставного фонда Общества.
2. О внесении изменений в устав Общества.

*Наблюдательный совет*

УНП 100041437

БЕЛАРУСБАНК

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2014 г.

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 2 123 302 | 2 120 090 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 6 477 | 5 634 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 16 700 457 | 13 383 907 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5 044 369 | 6 303 459 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 16 800 029 | 15 761 974 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 127 318 064 | 112 469 711 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 5 000 772 | 4 544 857 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | - | 118 109 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 983 865 | 5 087 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 4 007 335 | 5 378 518 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 517 | 7 778 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 15 | Деловая репутация | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | 901 279 | 1 171 971 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | 178 886 466 | 161 271 095 |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | 3 889 990 | 4 921 000 |
| 20 | Средства банков | 1202 | 27 880 268 | 21 782 554 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | 112 086 387 | 100 239 976 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 11 090 320 | 9 825 703 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 878 | 1 452 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | 1 198 650 | 1 038 951 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | 156 146 493 | 137 809 636 |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | 16 687 553 | 16 687 553 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | - | 98 |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | 1 258 313 | 1 108 430 |
| 31 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 1 635 118 | 2 910 061 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | 3 158 989 | 2 754 854 |
| 33 | Всего капитал, принадлежащий головной организации-банку | | 22 739 973 | 23 460 996 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | - | 463 |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 22 739 973 | 23 461 459 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 178 886 466 | 161 271 095 |

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
на 1 июля 2014 года

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 10 005 078 | 9 112 948 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 8 358 408 | 6 960 618 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 646 670 | 2 152 330 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 193 660 | 884 056 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 539 069 | 265 001 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 654 591 | 619 055 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 1 187 | 984 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (3 050) | (1 502) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 39 628 | 213 373 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 455 294 | 125 457 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 194 004 | 224 063 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 538 862 | 455 181 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 2 248 145 | 2 020 763 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 339 883 | 273 106 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 551 150 | 1 046 946 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 115 867 | 151 927 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 435 283 | 895 019 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | - | 12 684 |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | 435 283 | 907 703 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | 435 283 | 907 700 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | - | 3 |

**Председатель Правления** **С.П.Писарик**

**Главный бухгалтер** **И.П.Лысоковская**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

■ Спорт-тайм

# БРАСТАЎЧАНЕ ЗНОЎ У ЛІЗЕ ЧЭМПІЁНАЎ!

**У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра поспехі беларускіх «пляжнікаў», «бронзу» Аліны Талай з брыльянтавым бляскам і трагічную страту ў беларускім футболе.**

**1. БГК імя Мяшкова без праблем справіўся з кваліфікацыяй Лігі чэмпіёнаў.** Спачатку брэсцкі клуб разграміў галандскі «Панінген» (36:23), а пасля вырваў перамогу ў славацкага «Татрана» (26:24). У апошнім матчы вылучыўся Дзяніс Рутэнка, які закінуў у вароты сапернікаў шэсць мячоў і стаў лепшым бамбардзірам у сваёй камандзе. Пасля матча **галоўны трэнер брастаўчан Жэлька БАБІЧ** не ўтойваў эмоцый: «Удзячны гульцам, якія змагаліся за кожны мяч і аддалі ўсе сілы на пляцоўцы. Гэтая перамога і для мяне, і для каманды значыць вельмі шмат. Няма часу святкаваць або адпачываць. Зусім хутка гуляць у SEHA-лізе».

На групавым этапе Лігі чэмпіёнаў БГК імя Мяшкова згуляе ў групе «А». Сапернікамі нашых гандбалістаў стануць нямецкі «Кіль», македонскі «Металург», харвацкі «Заграб», іспанскі «Лаграньё» і французскі ПСЖ.



**2.** У другім матчы рэгулярнага чэмпіянату КХЛ **мінскае «Дынама» саступіла рыжскаму «Дынама» — 2:4.** У «зубраў» шайбы на рахунку Джонатана Чычу і Пола Шчэхуры. Пасля матча **галоўны трэнер «бела-сініх» Любамір ПОКАВІЧ** пракаментаваў дзеянні сваіх падапечных: «Лёс гульні вырашыўся ў другім перыядзе. Пры ліку 1:0 мы мелі нямала шанцаў развіць поспех, але, у адрозненне ад саперніка, мы іх не рэалізавалі. Спрабавалі змагацца да канца, закінулі адну шайбу. Маглі, напэўна, закінуць яшчэ адну, але шмат нашых шайбаў засталося на шчытках рыжан».

**3. Зборная Беларусі па пляжным футболе выйшла ў другі групавы этап кваліфікацыі чэмпіянату свету.** На першым этапе наша зборная перайграла каманду Турцыі (2:1) і саступіла расіянам (2:4). Але паражэнне ад усходніх суседзяў не перашкодзіла беларусам заняць другое месца ў групе і прадоўжыць змагацца за пуцёўку на сусветнае першынство.

**4. Аліна Талай фінішавала трэцяй** на дыстанцыі 100 метраў з перашкодамі **на апошнім этапе «Брыльянтавай лігі»**, які праходзіць у Бельгіі. Пераможцы, амерыканскай спартсменцы Крысці Кэстлін, наша лёгкаатлетка саступіла 0,13 сек.

**5.** Ва ўзросце 30-ці гадоў **пайшоў з жыцця галкіпер пінскага футбольнага клуба «Хваля» Мікалай Адамец**. У шпіталі, куды трапіў футбаліст, канстатавалі кровазліццё ў мозг.

Мікалай Адамец нарадзіўся ў Мікашэвічах, выхаванец мазырскай «Славіі». Да пінскай «Хвалі» чатыры сезоны гуляў за мікашэвіцкі «Граніт», яшчэ раней выступаў за «Мінск». У футбаліста засталіся жонка і дачка.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■ На тэму дня

# НЕ ЎПЭЎНЕНЫ — НЕ БЯРЫ



## НАШЫ СУЧАСНЫЯ ВЕДЫ ДАЮЦЬ ПАДСТАВУ ЛІЧЫЦЬ ГРЫБЫ ВЕЛЬМІ КАШТОЎНЫМ ПРАДУКТАМ, АЛЕ...



**Грыбы ўжываліся ў ежу з даўніх часоў. Пытанне аб ядомасці або атрутнасці тых ці іншых з іх вырашалася пакаленнямі чыста доследным шляхам. Насельніцтва розных краін ужывае ў ежу толькі невялікую колькасць відаў ядомых грыбоў (каля 100 відаў). У асобных жа мясцовасцях, як у нас, напрыклад, збіраюць і спажываюць не больш за 10–15 відаў грыбоў.**

**Сёлета спецыялісты-міколагі адзначаюць небывалы іх ураджай. Аб прычынах «грыбнога» года, асаблівасцях грыбнога сезона і ўжывання ў ежу грыбоў нам раскажа загадчыца лабараторыі мікалогіі Інстытута эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вольга ГАПІЕНКА.**

**— Вольга Сцяпанаўна, што паўплывала на такую высокую ўраджайнасць грыбоў?**

— Проста стварыліся вельмі спрыяльныя ўмовы для іх развіцця. Гэта звязана з кліматычнымі ўмовамі: спачатку глеба добра прагрэлася ў ліпені-жніўні, затым пачаліся дажджы і зямля насыцілася вільгаццю, потым наступіла пахаладанне. Халады прастымулявалі развіццё міцэлію грыба.

**— У якія рэгіёны краіны варта ехаць грыбнікам? Ці высокая ўраджайнасць грыбоў назіраецца па ўсёй тэрыторыі краіны?**

— Баравікі сёлета распаўсюджаны па ўсёй Беларусі. У кожнага грыбніка ёсць, вядома, свае любімыя месцы, але на тэрыторыі Віцебскай, Гродзенскай і часткі Брэсцкай вобласці сапраўды назіраецца больш грыбных месцаў. Ёсць асобныя мясціны і ў Палессі, але асноўная маса грыбоў сканцэнтравана на паўночным захадзе краіны.

**— Ці ёсць цыклічнасць у такіх ураджайных на грыбы гадах? Як можна спрагназаваць наступны «грыбны» год?**

— У любога арганізма ёсць свае перыяды. Так і ў грыба ў залежнасці ад яго віду розніца паміж пікамі ўраджайнасці складае ад 2-х да 5-ці гадоў. Напрыклад, для баравікоў — гэта 3, а для лісічак — 2–3 гады. Аднак лісічкі ў апошні час «збіліся» са свайго звычайнага графіка. Некаторыя спецыялісты звязваюць гэта з тэорыяй змены ўзроўню грунтавых водаў. Гэта значыць, што лісічак становіцца больш, калі грунтавыя воды размяшчаюцца далей ад паверхні.

Вядома ж, калі б за год не здаралася прыродных анамалій, то цыклы былі б больш стабільнымі і прадказальнымі. Таму прыродную карэкціроўку варта таксама ўлічваць, бо ўсе арганізмы ўзаемазалежныя і знаходзяцца ў біяцэнозе.

**— Калі пачынаецца і заканчваецца сезон збору грыбоў? Тут ёсць пэўныя біялагічныя рамкі або гэта залежыць выключна ад надвор'я?**

— Біялагічныя рамкі вызначаюцца самой прыродай. Ёсць восеньскія, летнія і вясновыя грыбы. У любым выпадку змяненне клімату, тэмпература, вільготнасць і якасць глебы ўплывае на час пачатку і канца сезона збору грыбоў. Напрыклад, сёлета летняй хвалі грыбоў амаль не было, затое восеньская хваля абяцае быць ураджайнай па ўсіх прыкметах.



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

**— А да якой групы прадуктаў можна аднесці грыбы, ці гэта асобная катэгорыя?**

— Грыбы вынесеныя ў асобнае «царства». Гэта не жывёлы і не расліны, а самастойная катэгорыя. Для грыбоў выпрацоўваюць нават свае ўласныя ДАСТы.

**— Але ж не ўсе грыбы прыносяць арганізму і здароўю чалавека карысць...**

— Адназначна так казаць нельга. Грыбы — гэта ўнікальная частка жывога свету, у іх сабраны і жывёльныя бялкі, і раслінныя элементы. Многае залежыць ад спосабу ўжывання і месца збору грыбоў. Не трэба збіраць грыбы ў небяспечных зонах: каля заправак, дарог, у горадзе. Дзецям не варта ўжываць грыбы да сямі гадоў. Баяцца ўжываць ядомыя грыбы не варта, бо грыбы нават не забараняюцца царквой падчас посту.

Трэба ўлічваць радыяцыйнае забруджванне пасля выбуху на чарнобыльскай АЭС. Грыбнікам варта праглядаць карты небяспечных месцаў, заражаных радыяцыяй і цяжкімі металамі. Такія карты можна знайсці ў лясгасах, у падпарадкаванні якіх знаходзіцца выбраны вамі лес. Грыбы ўбіраюць усе цяжкія мікраэлементы з глебы. У чарнобыльскай зоне нават выкарыстоўвалі такі метад ачысткі глебы грыбамі. Затым, праўда, паўстала пытанне, якім чынам утылізаваць такія заражаныя грыбы і іх грыбніцу. Як ні дзіўна, але грыбы набіраюць гэтыя таксічныя рэчывы для свайго развіцця.

**— Ці можна сказаць, калі грыб вялікі, то ён таксічны?**

— Калі грыб сам па сабе вырас вялікі, то ў ім больш назбіралася і шкодных рэчываў. У выпадку, калі грыб вялікі ад старасці, ён уступае ў працэс аўтолізу — самараскладання. Зразумела, такі грыб браць нельга. Ён аналагічны, напрыклад, мясу, якое загнівае. У сярэднім аптымальны для збору і ўжывання ў ежу перыяд жыцця грыба ад 2-х да 6 дзён. Калі ж вы ўсё ж такі сабралі такія грыбы, то першую ваду пры варцы абавязкова неабходна зліць.

**— Не сакрэт, што грыбы — гэта цяжкая ежа. З якімі прадуктамі лепш за ўсё камбінаваць грыбы, каб яны лепш засвоіліся?**

— Людзям з захворваннямі страўніка, печані не рэкамендуецца ўжываць шмат грыбоў, бо арганізму цяжка будзе перапрацоўваць бялкі жывёльнага паходжання і клятчатку. Грыбы варта есці ў меру. Найлепш спалучаюцца грыбы са сметанковымі прадуктамі, напрыклад, са смятанай (нездарма ў Францыі існуе асобная страва — жульен, які гатуюць з грыбоў, запечаных у вяршках пад сырнай скарынкай).

**— У Японіі расце грыб шыітаке, вядомы сваімі карыснымі ўласцівасцямі. Мабыць ёсць у Беларусі грыбы, якія дапамагаюць пры розных захворваннях?**

— Гэты грыб таксама распаўсюджаны і ў Кітаі. Самымі карыснымі лічацца летнія апенькі, шыітаке і неядомы лакіраваны чырвоны грыб — губа, які выкарыстоўваецца толькі ў медыцынскіх мэтах. Апошні ў нас, дарэчы, занесены ў Чырвоную кнігу і пакуль толькі імпартуецца ў выглядзе лекаў. Біялагічна актыўныя злучэнні, якія здабываюць з насення лакіраванай чырвонай губы, вельмі карысныя для здароўя, стымулююць работу сэрца. У Беларусі сярод найбольш карысных грыбоў — баравік і лісічкі. Дарэчы, баравікі ўмацоўваюць сэрца, а грузды і лісічкі павышаюць імунітэт. Лячэнне грыбамі называецца фунгатэрапіяй. Наяўнасць карысных уласцівасцяў залежыць таксама ад правільнай тэрмічнай апрацоўкі грыбоў. Час апрацоўкі вызначаецца індывідуальна для асобнага віду грыба, увогуле — да гатоўнасці, але не трэба пераварваць, інакш у грыбе застанецца толькі «цяжкая» для страўніка клятчатка. Ва ўсім павінна быць мера!

**— Якія перавагі культываваных грыбоў перад дзікарослымі?**

— Гэта залежыць ад субстрату, які выкарыстоўваюць фірмы-вытворцы. Больш за тое, ад змены глебавага субстрата нават на тэрыторыі адной краіны адзін і той жа грыб можа быць ядомым ці не.

Напрыклад, некаторыя людзі да гэтага часу збіраюць свінухі тоўстыя (благушкі). Да 80-х гадоў гэты від не выклікаў атручэнняў на тэрыторыі Беларусі, у той час як у Еўропе ён ужо даўно быў забаронены. Цяпер грыб вынесены ў разрад ядавітых і ў Рэспубліцы Беларусь. Прычына таму — карбанатныя заходнія глебы, якія рабілі грыб атрутным, у адрозненне ад распаўсюджанага ў Беларусі кіслотнага субстрату.

Рызыкаваць не трэба, бо свінуха тоўстая не выклікае імгненнага атручвання, але пры неаднаразовым ужыванні выклікае сур'ёзныя хваробы крыві, якія знішчаюць антыцелы ў арганізме і прыводзяць да зніжэння імунітэту.

**Алеся ВАРАБ'ЁВА.**

### Даведка:

Лекары адзначаюць, што большасць выпадкаў атручвання выкліканыя ўжываннем не ядавітых, а ўмоўна ядавітых або нават ядомых грыбоў. Атручэнні адбываюцца з-за няправільнага захоўвання і парушэнні тэхналогіі прыгатавання грыбоў.

Апошні выпадак атручэння ядавітымі грыбамі быў у Мінску ў 2009 годзе, калі бледнай паганкай атруціліся два чалавекі, яшчэ пяць — свінухамі (кабылкамі).

### ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА ГРЫБЫ:

1 Самы дзіўны грыб планеты носіць, можна сказаць, паэтычную назву «плазмодый». Плазмодый умее хадзіць! Перамяшчаецца, вядома, павольней за слімака, але за некалькі дзён можа ўзлезці на пень. Жыве ён літаральна ў нас пад нагамі, але адразу яго не заўважыш, ён чымсьці нагадвае медузу. Па лесе рухаецца, перавальваючыся з боку на бок.

2 Грыбы змяшчаюць у сабе глутамат («пяты смак»), свабодныя амінакіслоты і рыбануклеатыды, за што іх празвалі «мясам для вегетарыянцаў». Грыбы здольныя надаваць пікантны смак ежы.

3 Грыб можна назваць самай вялікай жывой істотай на планеце. Некаторыя падземныя грыбніцы ў Паўночнай Амерыцы займаюць плошчу ў сотні гектараў і маюць вагу, якая ў дзясяткі разоў пераўзыходзіць сям'ю кітоў. Адзін з такіх грыбоў расце ў амерыканскім штаце Арэгон. Яго грыбніца займае амаль 900 гектараў і мае вагу ў сотні тон.

4 У Італіі, Францыі, Харватыі расце адзін з самых дарагіх грыбоў у свеце — труфель. Іх высокі кошт абумоўлены і кароткім тэрмінам захоўвання — вытанчаны водар выпараецца за некалькі дзён. Самыя лепшыя гатункі труфеля прадаюцца па 2 тысячы еўра за 1 кг.

5 Ёсць сярод грыбоў і сапраўдныя драпежнікі, якія ловяць дробных насякомых. Грыбы-паляўнічыя абзавяліся клейкімі наростамі і іншымі прыстасаваннямі для лоўлі жывёл. Існуюць грыбы, якія сілкуюцца вусенямі. Яны выкідваюць на адлегласць да 1 метра насенне, якое прыліпае да цела вусеня. Насенне паступова прарастае ў целе ахвяры, знішчаючы яе.

6 Многія грыбы лятаюць па паветры. Ёсць грыбкі, якія насяляюць верхнія слаі атмасферы на вышыні звыш 30 кіламетраў. Існуюць грыбы, якія жывуць унутры млекакормячых. Зафіксаваны выпадкі развіцця плесневых грыбоў на паверхні сернай кіслаты.

7 Некаторыя грыбы свецяцца ў цемры. Лёгкае, трохі зялёнае свячэнне ўзнікае ў выніку хімічных акісляльных рэакцый, якія адбываюцца ў клетках грыбоў у момант паглынання імі кіслароду.

## АДНЫ ШУКАЮЦЬ ГРЫБЫ, А ІНШЫЯ — ГРЫБНІКОЎ

**За выхадныя дні ў лясах заблудзілі 11 грыбнікоў.**

Восем паведамленняў пра грамадзян, што пайшлі ў лес і не вярнуліся, паступілі ў службу «101» у суботу. Пяцёра з гэтых людзей блукалі ў лясах Віцебскай вобласці. Так, удзень стала вядома пра мужчыну 1971 года нараджэння, які згубіўся ў лясным масіве каля вёскі Іванава Віцебскага раёна. Выратавальнікі знайшлі яго праз тры гадзіны. З ранку блукаў па лесе каля вёскі Палоўнікі таго ж раёна і пенсіянер. Ён самастойна выйшаў з угоддзяў толькі ўвечары.

У нядзелю званкоў на «101» было некалькі менш. Удзень стала вядома пра пяцярых грамадзян, якія заблудзілі ў лясным масіве каля вёскі Аланцьева Аршанскага раёна. Работнікі МНС адшукалі іх праз тры з паловай гадзіны. Тры грыбнікі згубіліся ўвечары каля вёскі Полцева Шумілінскага раёна. Калі іх знайшлі, на шчасце, патрэбы ў меддапамозе яны не мелі.

## ЗАБЛУКАЎШЫЯ Ў ЛЕСЕ

**Для аматараў ціхага палявання наступілі благаслаўлёныя часы — грыбоў у лесе як ніколі. Але разам з гэтым прыбавілася працы для міліцыі і ратавальнікаў. Як паведаміла старшы інспектар Магілёўскага ўпраўлення МНС Вольга НЕХАРОШЫХ, толькі за 6 верасня ў рэгіёне заблудзіліся 3 пенсіянеры, знайсці ўдалося толькі дваіх. 80-гадовую бабулю ўсё яшчэ працягвалі шукаць у панядзелак.**

Больш пашчасціла 4-м грыбнікам, што заблудзілі ў клічаўскіх лясах 3 верасня. А сёмай гадзіне вечара таго ж дня яны выйшлі з лесу самастойна. А вось маладой жанчыне з 4-гадовым дзіцем, якія згубіліся ў быхаўскім лесе, дарогу дадому дапамаглі знайсці міліцыя, выратавальнікі і мясцовыя жыхары. Гэта адбылося а першай гадзіне ночы.

Выратавальнікі раяць грыбнікам не хадзіць у лес у адзіночку, не адпраўляцца туды пры пахмурным надвор'і, браць з сабой запалкі, компас, нож, лекі. Апранацца трэба ў непрамакальную вопратку і мець надзейны абутак. Не забудзьце паведаміць пра тое, што вы ідзяце ў лес, сваім родным, а таксама зарадзіце мабільны тэлефон. Калі вы яго забылі, не губляйцеся. Памятайце, вас знойдуць, таму ваша задача пратрымацца ў лесе нейкі час і зрабіць усё магчымае, каб вас хутчэй убачылі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ЗНОЙДЗЕНА ЦЕЛА ГРЫБНІКА

**Ратавальнікі атрымалі інфармацыю пра пенсіянера, які заблудзіўся, ад дзяжурнага РАУС раніцай 5 верасня.**

Мужчына 1935 года нараджэння 4 верасня пайшоў па грыбы ў лясны масіў каля вёскі Дзікева Германовіцкага сельсавета і не вярнуўся. Пошукі пенсіянера, якія праводзіліся 5 і 6 верасня, не далі вынікаў, а 7 верасня было знойдзена цела мужчыны. Па гэтым факце праводзіцца праверка.

У мінулыя выхадныя ратавальнікі і міліцыя шукалі грыбнікоў у Сенненскім, Бешанковіцкім, Віцебскім, Шумілінскім раёнах.

**Ул. інф.**

■ Камунальныя стасункі

# ПРЭЦЭДЭНТ СТВОРАНЫ: ЦІ ПАСПАКАЙНЕЮЦЬ КВАТЭРНЫЯ ДЭБАШЫРЫ?

**Мінулы тыдзень быў адзначаны гучнай падзеяй: упершыню ў Беларусі суд разглядаў справу кватэрнага дэбашыра. Жыхарка сталічнага шматпавярховіка Галіна Г. дамагалася, каб яе суседа Аляксандра С. прымусілі прадаць кватэру, бо ёй надакучылі яго шумныя пагулянкі, якія заміналі жанчыне спаць па начах. Паводле новага Жыллёвага кодэкса, што дзейнічае з сакавіка 2013 года, адчужэнне жылплошчы цяпер магчыма ў выпадку парушэння ўласнікам правілаў карыстання ёю або няплаты за камунальныя паслугі. Справа атрымала шырокі рэзананс, але ці азначае яе вынік, што грамадзяне перастануць пакутаваць ад шумных суседзяў?**



Іск на прымусовы продаж жылплошчы падала ЖРЭА Партызанскага раёна сталіцы. Да звароту ў суд Аляксандра С. ужо восем разоў прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці, неаднаразова яму даводзілася выплачваць штрафы, самы вялікі з якіх дасягнуў 1,2 млн рублёў. Адметна, што сам адказчык, як і яго жонка, ужо мае судзімасць. Аднак грошы за мінулыя штрафы — гэта ўсё, чым паплаціўся аматар шумных гульбішчаў. У задавальненні іску — адчужэнні ў С. жылога памяшкання і пакрыцці ім судовых выдаткаў — суд Партызанскага раёна адмовіў. Прычына — адсутнасць з боку ЖРЭА пісьмовага паведамлення аб прымусовым продажы кватэры, якое павінны былі накіраваць дэбашыру.

— Працэс прайшоў у адпаведнасці з нормамі, хоць мы чакалі іншага выніку, — прызнаўся **намеснік дырэктара ЖРЭА па ідэалагічнай рабоце Партызанскага раёна Віталь БЫХАЎЦОЎ.** Аднак прызнаў, што казаць пра абскарджанне прысуду яшчэ рана.

Падчас працэсу адказчык пацвердзіў, што Віталь Быхаўцоў у вуснай форме папярэджваў яго аб магчымасці прымусовага продажу кватэры, калі той не перастане ладзіць шумныя папойкі. Але чаму не было даслана пісьмовае папярэджанне?

— У артыкуле 155 ЖК указана, што калі чалавека тры і больш разоў прыцягваюць да адміністрацыйнай адказнасці, то яго могуць прымусіць прадаць жыллё. Пры гэтым за месяц да падачы іску ў суд грамадзяніну трэба пісьмова паведаміць аб неабходнасці пагасіць запазычанасць або выправіць парушэнні. Але як можна выправіць шум, які ўжо адбыўся? Гэта немагчыма! Таму, на нашу думку, неабходнасці дасылаць паведамленне не было, — патлумачыў намеснік дырэктара.

Такім чынам, атрымліваецца, нягледзячы на гучны розгалас, кватэрныя дэбашыры па-ранейшаму могуць спаць спакойна, а суседзям і камунальнікам давядзецца шукаць новыя спосабы для іх утаймавання. Праўда, адзначыў Віталь Быхаўцоў, новы Жыллёвы кодэкс усё ж крыху дысцыплінаваў людзей. Так, жыльцы сталі больш акуратна аплачваць жыллёва-камунальныя паслугі. Аднак цяпер няма градацыі па выплаце штрафаў: раней яна акрэслівала сумы ад 10 да 30 базавых велічынь, а ў новым кодэксе значыцца проста — да 30 базавых, гэта значыць, што суд можа прызначыць да выплаты самую мінімальную суму.

Што да аматараў ладзіць шумныя бяседы, то, па словах намесніка дырэктара ЖРЭА, у Партызанскім раёне ёсць толькі адзін жыхар, якога ў гэтым плане можна параўнаць з С., аднак і той ужо паўгода як не стварае праблем і не замінае жыць і адпачываць суседзям.

— Да нас паступае шмат падобных зваротаў, і ў 60% выпадкаў людзям бывае дастаткова аднаго папярэджання. Больш як да складання аднаго-двух пратаколаў справа не даходзіць, — падзяліўся Віталь Быхаўцоў.

